Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 98 (5772) | 28 красавіка 1937 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Выкрыем да канца ўсіх і ўсякіх двурушнікаў! Ператворым нашу партыю ў непрыступную крэпасць большэвізма!

(З першамайскіх лозунгаў ЦК ВКП(б))

БОЛЬШ ТРЫВОГІ ЗА ЛЁС БУДУЧАГА ЎРАДЖАЮ

Перадавыя калгасы і соўгасы нашай рэспублікі, рыхтуючыся да міжнароднага пролетарскага свята Першага мая, разгарнулі настойлівую большэвіцкую барацьбу за высокі ўраджай.

У калгасе «Комінтэрн», Магілеўскага раёна, закончана сяўба зернавых і ільну. Гэтыя культуры пасеяны высокаякасна, пры захаванні ўсіх агратэхнічных правіл. Калгасы імя Кірава і «Шлях Ільіча», Бабруйскага раёна, пасеялі звёс, ячмень, яравое жыта і пшаніцу і прыступілі да пасадкі бульбы. Скончылі сяўбу ранніх зернавых некаторыя соўгасы, напрыклад, соўгасы «Уваравічы», «Харомцы», «Перамога социялізма», «Рань», «Каменка», і прыступілі да пасадкі бульбы і іншых прапашных культур. Прычым, некаторыя з гэтых соўгасаў перавыканалі план сяўбы зернавых культур.

Аднак, гэта толькі асобныя перадавыя калгасы і соўгасы паспяхова праводзяць веснавую пасеўную кампанію. У цэлым-жа ў распубліцы сяўба праходзіць зусім незадавальняюча. На 20 красавіка план сяўбы яравых выканан толькі на 22,5 проц. Асабліва марудна разгортваецца масавая сяўба яравых у такіх раёнах, як Расонскі (старшыня райвыканкома т. Партноў, сакратар РК КП(б)Б т. Фрыдзон), дзе план сяўбы выканан толькі на 4,5 проц.; Віцебскі (старшыня райвыканкома т. Дваровскі, сакратар РК КП(б)Б т. Рувінцаў) — план выканан на 4,4 проц.; Парадоцкі (старшыня райвыканкома т. Еўсенка, сакратар РК КП(б)Б т. Кенін) — 4,7 проц.; Асвейскі (старшыня райвыканкома т. Мартынаў, сакратар РК КП(б)Б т. Кацуба) — 6,0 проц.; Суражскі (старшыня райвыканкома т. Асмалоўскі, сакратар РК КП(б)Б т. Чунізераў) — 6,4 проц.

Недапушчальна запазваюць веснавую сяўбу некаторыя соўгасы сістэмы Наркомсоўгасаў. Напрыклад, соўгасы «Чырвоны маяк» (дырэктар т. Казакоў), «Зара захаду» (дырэктар т. Лінкевіч), «Маладая гвардыя» (дырэктар т. Доўбня), «Горкі-Абчак» (дырэктар т. Мураўёў), выканалі свае планы сяўбы ад 8 да 10 проц.

Прычына запаяжкі веснавой пасеўнай кампаніі ў распубліцы прадаўжае аставацца той-жа самай, што і раней: няма ў многіх раённых партыйных і совецкіх арганізацыяй, у кіраўнікоў раёнаў патрэбных дапатаў аб веснавой сяўбе, няма трывогі за лёс будучага ўраджаю.

Вазьміце, напрыклад, Бягомльскі раён. Старшыня райвыканкома т. Шэмпель, сакратар РК КП(б)Б т. Дэйч). План веснавой сяўбы па гэтаму раёну выканан толькі на 14,8 проц; па пасеву ільну план выканан усяго на 5,1 проц. Не гледзячы на такое ганебнае адставанне, кіраўнікі раёна не вельмі трывожацца за сяўбу. Сакратар райкома партыі т. Дэйч нават у сваім справаздачным даклазе на раённым партыйным сходзе не палічыў патрэбным сказаць у двух—трох словах сказаць аб ходзе веснавой сяўбы ў раёне. Абыйшоў у сваім выступленні маўчаннем гэта пытанне і старшыня РВК т. Шэмпель. Гэты факт даволі ярка паказвае, што кіраўнікі Бягомльшчыны не ўсвядомілі задач партыі.

Тое-ж самае можна сказаць і ў дачыненні да Смалявіцкага раёна (старшыня райвыканкома т. Халаркевіч, сакратар РК КП(б)Б т. Кудман). Па раёну план веснавой сяўбы выканан на 11,3 проц. Многія калгасы гэтага раёна толькі прыступаюць да сяўбы. У радзе калгасаў дрэнна арганізавана праца на палявых работах, слабая дысцыпліна, позняя выхады на работу. Аб усім гэтым добра ведае і райвыканком і райком партыі, але ніякіх мер не прымаюць, каб разгарнуць масавую сяўбу. Як відаць, і ў кіраўнікоў Смалявіцкага раёна няма трывогі за лёс будучага ўраджаю.

У радзе раёнаў няма належнай барацьбы за якасць сяўбы. У калгасе «Чырвоны трудавік», Гроскага раёна, сеюць лён непрапушчаным праз трашчотку насеннем, якое вельмі засмечана пустазеллем. У калгасах «Чырвоны барацьбіт» і імя Кагановіча, гэтага-ж раёна, дрэнна апрацоўваюць глебу, авёс сеюць у аднавор.

Ні мінуты нельга цярпець далей такое становішча. Неадкладна трэба павысіць тэмпы і якасць веснавой пасеўнай кампаніі. Рэспубліка ўступіла ў самы адказны этап барацьбы за сталінскі ўраджай. Злачынна прапускаць зараз спрыяючыя сяўбе дні.

Сур'ёзнейшую ўвагу трэба звярнуць на разгортванне масавай сяўбы аднаасобнымі сялянскімі гаспадаркамі. Нельга-ж цярпець такога становішча, што ў радзе раёнаў многім аднаасобнікам не адведзена яшчэ зямля пад пасевы яравых. Неадкладна трэба адвесці зямлю пад яравыя пасевы аднаасобным гаспадаркам і арганізаваць у іх сяўбу.

Выключную ўвагу — якасці сяўбы. Добраякасная апрацоўка глебы, сяўба добрым, праверaным на ўсхожасць і пратручаным насеннем, выкарыстанне ўсіх вілаў угнаенняў — вось аб чым не трэба забываць ні на адну хвіліну. Поўнасцю выкарыстаць на сяўбе ўсе трактарныя і конныя сеялкі. ЦК КП(б)Б у пастанове сваёй, якая змешчана ў «Звязде» 24 красавіка, указаў на ігнараванне ралковай сяўбы ў Магілеўскім і Бешанковіцкім раёнах. ЦК абавязаў РК і РВК гэтых раёнаў «устанавіць праз райза штодзённы кантроль за работай конных сеялак у калгасах, і ў больш злосных выпадках ігнаравання ралковай сяўбы прыцягваць віноўных да адказнасці». Гэта ўказанне ЦК з'яўляецца сур'ёзным папярэджаннем для ўсіх кіраўнікоў раёнаў нашай рэспублікі. Яны з гэтага папярэджання павінны зрабіць для сябе ўсе вывады.

Трэба адзначыць, што і ў Наркамземе БССР усё яшчэ няма патрэбных клопатаў аб будучым ураджаі. Сяўба ў распубліцы праходзіць вельмі дрэнна. У радзе раёнаў парушаецца агратэхніка. Многія машынна-трактарныя станцыі працуюць з перабоямі. А ў Наркамземе толькі фіксуюць гэта, канкрэтных-жа мер, практычнай дапамогі раёнам, калгасам пакуль што не аказваюць. Пара, нарэшце, пакласці канец гэтаму бюракратычнаму кіраўніцтву калгасамі, сяўбой. Наркамзем павінен арганізаваць кантроль за працай загадчыкаў райза, каб падсцёгваць адстаючых, дапамагаць сваім кадрам у кіраўніцтве пасеўнай, накіроўваць іх увагу на цэнтральныя звенні работы, ад якіх залежыць лёс сяўбы.

Сяўба — важнейшая ў рэспубліцы работа. Працоўныя, рыхтуючыся да Першага мая, палымаюць спяг социялістычнага спаборніцтва. Абавязак кіраўніцтва раёнаў і округ заключаецца ў тым, каб усю падрыхтоўку да Першага мая правесці пад знакам барацьбы за паспяховае сканчэнне сяўбы, усямерна разгортваючы для гэтага социялістычнае спаборніцтва, заахвочваючы стаханаўцаў.

Сустрэнем Першае мая новымі перамогамі на социялістычных палях!

ШЫРЭЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШУЮ СУСТРЭЧУ ПЕРШАГА МАЯ

ПЕРАЗЫКОНВАЮЦЬ НОВЫЯ НОРМЫ

Гомельскі завод сельскагаспадарчых машын свой вытворчы план за 20 дзён красавіка выканаў на 103,7 проц. Па заводу налічваецца 500 стаханаўцаў. Уведзеныя новыя нормы ўжо перавыконваюцца.

Штампоўшчыцы кавальска-прэсавага цэха тт. Шулякова і Іванчанка сталі значна перавыконваць свае нормы. Першая дае штодзенна ў сярэднім 199 проц. нормы, другая—143 проц. Рабочы брыгады шырспажыву тав. Гарбатоўскі пры новай норме 40 замкоў штодзенна збірае 65. Рабочы ліцейнага цэха тав. Барысенка сваё заданне выконвае на 130 проц., тав. Беліч—на 116 проц. 22 красавіка ў першы дзень работы па новай норме слесар механазборачнага цэха тав. Аўдзейкін выканаў сваё заданне на 150 проц. Другі слесар гэтага цэха тав. Царык—на 181 проц., маляр Нікіценка—на 139 проц.

Рыхтуючы дастойную сустрэчу пролетарскаму святу Першае мая, у дрэваапрацоўчым цэху пушчана ў эксплаатацыю новая механічная афарбоўка машын «Клейтон». Працяг афарбоўкі скарочан да 15 мінут.

П. КАЛАМІЕЦ.

ЗА ПЕРАДАВОЕ МЕСЦА У ПЕРШАМАЙСКАЙ КАЛОНЕ

У рэзультаце вытворчага энтузіязма, ахапіўшага рабочы калектыў панчошна-трыкатажнай фабрыкі «Чырвоны тэкстыльшчык» (Менск) у сувязі з падрыхтоўкай да пролетарскага свята Першага мая, ліквідавана адставанне, якое было ў мінулыя месяцы. У той час, калі фабрыка сакавіцкі план выканала ўсяго на 92 проц., за дзве дэкады красавіка яна дала 113 проц. плана.

Разгарнулася спаборніцтва за перадавое месца ў першамайскай калоне. Перадавым ізюе трыкатажны цэх, які выканаў план 2 дэкад красавіка на 135 проц.

Значна ўзнялі сваю выпрацоўку асобныя стаханаўкі. Трыкатажніца Абрамовіч дае 200 проц. нормы, пры поўнай ліквідацыі і знішчэнні браку. Трыкатажніца Лямберг дае 197 проц. нормы, Мірончык—157 проц., матальшчыца Цымерман — 200 проц., матарыстка Окунь—180 проц. і інш.

Ударніца-комсамолка Зітрыкевіч, якая ў сакавіку давала толькі норму, сустракае свята новай перамогай—яна выконвае норму на 170 проц. пры значным палепшанні якасці прадукцыі. Трыкатажніца Мачальская ў сакавіку не выконвала нормы, а зараз дае 130—140 проц., матарыстка Русецкая, якая таксама ў сакавіку не выпрацоўвала нормы, зараз давяла выпрацоўку да 120—130 проц.

ЗАКОНЧЫЛІ СЯЎБУ ЗЕРНАВЫХ

ГЛУСК. (Па тэлефону). Соўгас «Харомцы» 21 красавіка закончыў сяўбу зернавых. Пасадку бульбы стараемся скончыць да міжнароднага пролетарскага свята — Першага мая.

Дырэктар соўгаса ЛУПСЯКОЎ.
Парторг КРАШКОЎ.



У сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны пасёлак» Петрыкаўскага раёна на палях бесперабойна працуюць машыны, у брыгадах разгортваецца социялістычнае спаборніцтва. НА ЗДЫМКУ: стаханаўцы калгаса І. І. Мойжэш і М. І. Адаменка, якія выконваюць норму сяўбы на радковай сеялцы на 160 проц., правяраюць якасць работы сеялкі.

Фото В. Лупейка (БСФ).

СПАБОРНІЦТВА ЗА СТАЛІНСКІ ЎРАДЖАЙ

На палях калгаса «Чырвоныя Міцькі», Міхалкаўскага сельсовета, Нараўлянскага раёна, шырока разгарнулася социялістычнае спаборніцтва за сталінскі ўраджай. З першых дзён палявых работ паміж брыгадамі заключаны дагаворы на высокаякаснае правядзенне сяўбы.

Высока ўзнялася прадукцыйнасць працы. Лепшыя калгаснікі-ўдарнікі Піскун Фядос, Кухлавец А., Шуба Г., Куксачэнка Г., Літвін С. штодзенна перавыконваюць нормы, даюць добрую якасць.

Усе калгаснікі змагаюцца за сканчэнне сяўбы да вялікага пролетарскага свята — Першае мая.

М. РАВІЦКІ.

ГРУБА ПАРУШАЮЦЬ АГРАТЭХНІКУ

Многія калгасы Старобінскага раёна не разгарнулі большэвіцкай барацьбы за павышэнне ўраджайнасці. Сяўбу праводзяць уручную, парушаюць агратэхніку.

Калгас «Прамень комуны», Чапялеўскага сельсовета, пры плане радковай сяўбы 180 гектараў пасеяў пакуль што толькі 18 гектараў, прычым увесь авёс пасеяны уручную.

У калгасе «Чырвоны бор», Старобінскага сельсовета, 4,5 гектара аўса пасеяна ў аднавор, глебу не пракультывавалі. У выніку гэтага шмат насення ляжыць на паверхні глебы і сохне, а частка ўжо ўзыйшла.

Калгас «Ударнік» пасеяў авёс засмечаны пічаціністым аўсюгом. У аднавор пасеяна пшаніца і авёс на плошчы 6 гектараў у калгасе «Чырвоная ніва».

Старшыні калгасаў «Перамога», «3-ці рашаючы», «Шлях да социялізма», «Чырвоны пуцілавец» і інш. катэгарычна адмовіліся пратручваць насенне.

Агратэхнічны персанал райземаддзела і МТС на парушэнне агратэхнікі сяўбы ў радзе калгасаў не рэагуе. Агрономы МТС Богуш, Дзялензік і Краўпоў у большасці сваёй сядзяць у канцылярыі, а калі і выязджаюць у калгасы, дык фактычна нічога не робяць.

В. КРУГЛІК.

СЕЕМ КАНЮШЫНУ

У калгасах Чарнянскага сельсовета, Шклоўскага раёна, разгарнулася сяўба канюшыны. Калгас «Новыя Аўчыненкі» засеяў 7 гектараў канюшыны, «Чырвоны спяг»—11,5 гектараў, «Аб'яднаная праца»—6 гектараў, імя Карла Маркса—11 гектараў, «Шлях пролетарыята»—10 гектараў і інш. Усяго па калгасах Чарнянскага сельсовета пасеяна 47,6 гектараў канюшыны. Сяўба праведзена добрым насеннем.

Калгасы змагаюцца за раннюю сяўбу ўсіх яравых культур.

І. РАКОМСКІ.

НЕ ЎЗНАЧАЛІЛІ СПАБОРНІЦТВА

Лепшыя людзі менскага дрэваапрацоўчага завода імя Молатава пачалі спаборніцтва на большэвіцкую сустрэчу пролетарскага свята Першае мая. Стаханавец тав. Баран (сталяр) за апошнія дні павысіў сваю выпрацоўку з 164 проц. да 200 проц. Сталяр Міхасенка 22 красавіка выканаў сваю дзённую норму на 186 проц. замест ранейшых 138 проц. Фрэзероўшчык Емелін у гэты дзень дасягнуў 294 проц. нормы ў той час, калі раней даваў у сярэднім 160 проц.

На жаль, энтузіязм, які ахапіў стаханаўцаў, не ўзначален кіраўніцтвам завода. Стаханаўцам не створаны ўмовы для ўзняцця прадукцыйнасці працы. У першым мэблевым цэху (начальнік Талянок), напрыклад, прастоі па віне адміністрацыі ўвайшлі ў сістэму. У сакавіку тут было 623 гадзіны прастою, за 20 дзён красавіка — 145 гадзін. Дрэнная праца сушылкі, незабяспечанасць работай прыводзяць да таго, што лепшыя стаханаўцы не выконваюць сваіх норм. Сталяр Будовіч, які раней выконваў норму на 200 проц., зараз дае не больш 110—114 проц. У асобныя дні ён нават не дасягае нормы выпрацоўкі. Сталяр Талкушына раней давала 240 проц. нормы, а зараз найвышэйшая яе выпрацоўка складае 186 проц. Гэта — не адзінкавыя выпадкі. Недарма завод не выконвае плана. Адсутнасць клопатаў аб стаханаўцах, нестварэнне умоў у рабоце ўсім рабочым — асноўныя прычыны ганебнага адставання завода.

Наркамат лясной прамысловасці БССР замест сапраўднага кіраўніцтва заводам займаецца ведамственымі спрэчкамі: каму ён павінен падначальвацца — Кіраўніцтву мэблевай прамысловасці ці Кіраўніцтву лесапільнай і апрацоўчай прамысловасці. У рэзультаце ніхто заводам не кіруе.

В. АСТРОЎСКІ.

СУСТРАКАЮЦЬ СВЯТА ЗАВЯРШЭННЕМ СЯЎБЫ

У соўгасе «Луцаўшчына», Лагойскага раёна, ужо 22 красавіка поўнасцю выканан план сяўбы яравых зернавых культур. Усяго засеяна 170 гектараў. Сяўба праведзена ралковымі сеялкамі і добраякасным, пратручаным насеннем.

Гэтых поспехаў соўгас дабіўся ў выніку разгортвання социялістычнага спаборніцтва, добрай арганізацыі працы палавых рабочых і трактарыстаў. Стаханаўцы і ўдарнікі штодзённа перавыконваюць нормы выпрацоўкі і даюць высокую якасць.

Трактарыст Куніцкі Андрэй за сваю змену на трактары «ЧТЗ» узорвае па 15 гектараў замест нормы 7. Трактарыст Адамовіч 18-радковай сеялкай засяваў у змену па 11—13 гектараў, пры норме 8 гектараў. Рабочыя Дрозд Аркадзі і Балабойкін узорваюць коньмі за дзень па 1,10—1,40 гектара замест нормы 0,90 гектара.

Рады стаханаўцаў і ўдарнікаў за сталінскі ўраджай з кожным днём павялічваюцца. Рабочы калектыў соўгаса ўзяў на сябе абавязак сустрэць першамайскае свята поўным заканчэннем сяўбы ўсіх яравых культур.

Н. ДУБІЦКІ.

НАПЯРЭДАДНІ ПУСКУ КАНАЛА ВОЛГА—МАСКВА

(Гутарка з наркомам воднага транспарта тав. Н. І. ПАХОМАВЫМ)

Нарком воднага транспарта тав. Н. І. Пахомаў, які наведаў 25 красавіка канал Волга — Масква, расказаў супрацоўніку ТАСС наступнае:

— Будаўніцтва канала Волга—Масква, якое цягнецца амаль 5 год, зараз падыходзіць к канцу. Асталіся лічаныя дні да адкрыцця канала. Цяжка знайсці падыходзячую ацэнку такой грандыёзнай падзеі, якой з'яўляецца канал Волга — Масква, бо яго нельга параўнаць ні з адным з існуючых водных шляхоў.

Шлюзы, плаціны, насосныя станцыі і іншыя пабудовы канала не маюць сабе роўных ва ўсім Саюзе. Совецкія воднікі ўжо пачуцця радасці і гордасці, што ў адной з дзейнічаючых водных магістралей Саюза ўступае новая, Сталінская магістраль.

У ліпені, калі поўнасцю закончацца ўсе аддзелачныя работы, канал увойдзе ў нармальную эксплаатацыю, пачнуцца нармальныя грузавыя і пасажырскія перавозкі. Да гэтага часу мы мяркуем у першай дэкадзе мая пачаць арганізацыю экскурсійных паездак па каналу на параходах 40—45 клм. паміж паўночным портам і шостым шлюзам.

На гэтым участку будуць курсіраваць новапабудаваныя чатыры цеплаходы: «Іосіф Сталін», «Вячеслав Молотов», «Михаил Калинин» і «Клим Ворошилов», кожны з якіх умяшчае па 204 пасажыры. Наркамвод назначыў капітанам цеплахода «Іосіф Сталін» аднаго з лепшых волжскіх капітанаў — тав. А. Я. Купрыянава, на цеплаход «Вячеслав Молотов» назначан таксама волжскі капітан — тав. Сутырын.

РАБОТА ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР ЗА ДЗВЕ ДЭКАДЫ КРАСАВІКА

Па даных кіраўніцтва Наркасучота за дзве дэкады красавіка прамысловасць БССР (без лесазагатовак) выканала 61,8 проц. месячнага плана.

Саюзная прамысловасць за дзве дэкады дала 57,1 проц. месячнага плана, пры гэтым Наркамлегпром (без ільнапрадзільнай фабрыкі імя Карла Маркса) 53,5 проц., Наркамцяжпром (без цэментнага завода) 56,1 проц. Да гэтага часу нельга ўстанавіць выкананне промфінплана лясной і харчовай прамысловасцю, бо гэтыя наркаматы не спусцілі прадпрыемствам месячны план.

Рэспубліканская прамысловасць (без лесазагатовак) выканала за дзве дэкады 64 проц. месячнага плана. Наркаммясцпром даў 63,5 проц., Наркамлеспром (без лесазагатовак) — 58,8 проц., Наркамлегпром — 65,7 проц. і Наркамгас (Белэнергатрэст) — 70,1 проц.

Выкананне плана па буйнейшых гарадах БССР ідзе наступным чынам: Менск выканаў 64,4 проц. месячнага плана, Віцебск — 60 проц., Гомель — 60,4 проц., Магілеў — 63,8 проц., Орша — 58,1 проц., Барысаў — 67 проц., Рэчыца — 55 проц.

СТОТЫСЯЧНЫ МІТЫНГ ПРАЦОЎНЫХ ПАРЫЖА

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 25 красавіка. (БЕЛТА). Учора ў Венсене (прыгарад Парыжа) адбыўся 100-тысячны мітынг працоўных Парыжа, скліканы парыжскім абласным советам профсаюзаў. Удзельнікі мітынга запэўнілі ўрад, што масы патрымаюць яго ў барацьбе супроць паляражання жыцця, у правядзенні ў жыццё плана буйных грамадскіх работ, прадугледжанага праграмай народнага фронта, у прадастаўленні пенсіі састарэлым працоўным, у роспуску фашысцкіх арганізацый і арышце іх кіраўнікоў.

На мітынгу выступілі генеральны сакратар парыжскага абласнога аб'яднання профсаюзаў Рэйно, старшыня саюза будаўнікоў Бру, сакратар усеагульнай канфедэрацыі працы Жуо і інш.

Адначасова ва ўсіх буйных пэнтрах Францыі дзесяткі тысяч будаўнічых рабочых на мітынгах і дэманстрацыях высоўвалі тыя-ж патрабаванні.

„Мундо обрэро" заклікае да барацьбы з трацкісцкімі бандытамі

МАДРЫД, 26 красавіка. (БЕЛТА). Орган компартыі «Мундо обрэро» змясціў рэдакцыйны артыкул з заклікам да ўсіх чэсных іспанцаў змагацца супроць трацкісцкай арганізацыі «Поум», узначальваемай кучкай авантурыстаў і палітычных бандытаў. «Гэта барацьба, — піша газета,— справа ўсяго народнага фронта». «Поум» і яго лідэры (Нін, Горкін, Портэла і інш.) на словах «адмяжоўваюцца» ад трацкізма, а на самой справе «Поум» і яго пэнтральны орган — барселонская газета «Баталья» сістэматычна вядуць кампанію супроць СССР, выяўляючы сапраўдны твар нічым непрыкрытага трацкізма.

Тактыка «Поум» — гэта падрыў адзінства рабочых і антыфашысцкіх арганізацый. Мэта гэтай тактыкі — раскол народнага антыфашысцкага фронта. «Мундо обрэро» падкрэслівае, што трацкісты ў Іспаніі служаць Франко таксама, як і сам Троцкі служыць Гітлеру.

Справа барацьбы з трацкізмам, — піша газета, — не ёсць справа адной комуністычнай партыі, а з'яўляецца прамым абавязкам усіх антыфашыстаў. Абараняць трацкізм — значыць свядома ці несвядома служыць ворагу.

Недахват хлеба ў Германіі

БЕРЛІН (сталіца Германіі), 25 красавіка. (БЕЛТА). Побач з труднасцямі ў галіне снабжэння мясам і тлушчамі, прадметам асобых клопатаў для фашысцкіх улад з'яўляецца хлеб. Так, напрыклад, афіцыяльныя даныя аб запасах пшаніцы і жыта гаворыць, што сваіх запасаў хлеба Германіі хваціць не больш чым да канца мая. Гэтым у значнай меры тлумачыцца павелічэнне за апошні час імпарту зярна. Так, імпарт зярна ў сакавіку быў павялічан на 16,6 мільёнаў марак у параўнанні з папярэднім месяцам.

Адным з важнейшых мерапрыемстваў у галіне хлебнай палітыкі з'яўляецца толькі што апублікаванае распараджэнне аб абавязковых пастаўках сялянамі хлеба надыходзячага ўраджаю фашысцкай дзяржаве. Калі да гэтага часу сяляне павінны былі пастаўляць толькі зярно, якое ідзе на хлеб, то новыя кантынгенты паставак ахватваюць і ўсе іншыя злакі (ячмень, авёс і т. д.).

ЗАБАСТОЎКА РАБОЧЫХ ГАРАДСКОГА ТРАНСПАРТА Ў ТОКІО

ТОКІО (сталіца Японіі), 25 красавіка. (БЕЛТА). Стачка звыш 15 тысяч рабочых такійскага гарадскога транспарта працягваецца. Сёння на шырокаразгалінёнай сетцы трамвайных ліній муніцыпалітэта (гарадскога самакіраўніцтва), згодна афіцыяльных даных, у руху знаходзілася толькі 278 вагонаў трамвая, замест звычайных 885 вагонаў. Да бастуючых далучыліся рабочыя яшчэ раду ліній аўтобусаў: замест звычайнага ліку 580 аўтобусаў у руху знаходзілася толькі 298 аўтобусаў.

Усе газеты адзначаюць выключную арганізаванасць бастуючых.

Муніцыпальныя ўлады па-ранейшаму настойваюць на «немагчымасці» далейшага павышэння заработнай платы і нават пагражаюць прымяненнем «моцнага сродку» (падразумяваючы масавае звальненне бастуючых). Перагаворы паміж бастуючымі і муніцыпальнымі ўладамі спынены.

Стачачны камітэт, згодна паведамлення агенцтва Домэй Пусін, адмаўляецца ад адкладвання перагавораў да таго часу, пакуль муніцыпальныя ўлады не згодзяцца задаволіць патрабаванні рабочых.

Рэарганізацыя баскскай арміі

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 26 красавіка. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Рэйтэр з Більбао (сталіца Баскскай аўтаномнай вобласці), баскскі ўрад учора прыняў сур'ёзныя меры, каб процідзейнічаць наступленню мяцежнікаў. Створан новы ваенны совет, які прыступіў ужо да рэарганізацыі баскскай арміі. Баскская армія, якая складаецца з розных атрадаў народнай міліцыі, пераўтвараецца ў рэгулярную. Прыняты рашучыя меры для падтрымання дысцыпліны на фронце і ў тыле.

У Більбао расклеен плакат компартыі, які заклікае да безагаворачнага падтрымання пастановы баскскага ўрада аб абавязковай ваеннай службе, да падтрымання дысцыпліны на фронце і ў тыле, да адзінства ўсіх антыфашыстаў і да больш рашучых мер супроць фашысцкай «пятай калоны» ў Більбао.

ПРЫЕЗД ЗАМЕЖНЫХ ТУРЫСТАЎ НА ПЕРШАМАЙСКАЕ СВЯТА

НЕГАРЭЛАЕ, 27 красавіка. (Кар. «Звязды»). Сёння з Францыі прыбыла праз Негарэлае ў СССР на першамайскае свята першая група замежных турыстаў у складзе 62 чалавек.

Група арганізавана «Інтурыстам» і французскім бюро падарожжа «Нордзіск». У большасці гэта рабочыя і служачыя розных прадпрыемстваў Францыі.

Турысты будуць прысутнічаць на першамайскіх урачыстасцях у Маскве, а затым выедуць у Ленінград.

Каменоў.

Узмоцнім рэволюцыйную пільнасць! Пакончым з палітычнай бесклапотнасцю ў нашым асяроддзі! *(З першамайскіх лозунгаў ЦК ВКП(б))*

НА СХОДЗЕ ВЕТРЫНСКАЙ РАЁННАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

ПОЛАЦК, 26 красавіка. (БЕЛТА). Скончыў сваю работу раённы сход Ветрынскай партыйнай арганізацыі. На прапяту пяці дзён 210 членаў і кандыдатаў партыі прыгранічнай Ветрынчыны ўсебакова абмяркоўвалі работу свайго райкома, ускрывалі буйнейшыя памылкі ў яго рабоце, рэзка і смела крытыкавалі недахопы. У спрэчках па дакладу сакратара райкома партыі т. Плоткіна выказалася 55 чалавек з 100 запісаўшыхся.

Пра што гаварылі комуністы?

Аб заціску крытыкі гаварыў т. Казакевіч. На партсходах сказаў ён, — ніколі не ўдавалася выступіць тым членам партыі, якія могуць што-небудзь сказаць адмоўнае аб рабоце райкома. Асабліва гэта наглядалася тады, калі ў якасці рэгуліроўшчыка спрачак сядзеў другі сакратар райкома т. Федарэнка.

Аб пякучасці кадраў гаварыў т. Харытоненка. У адным райвыканкоме, адзначыў ён, за два гады змяніліся чатыры старшыні, пяць сакратароў і тры загадчыкі райза. Такая-ж цякучасць і ў партыйным апараце.

Выступаўшы на сходзе т. Багданаў і іншыя таварышы ўскрылі прычыны гэтай непармальнай з'явы. Райком і асабіста яго першы сакратар т. Плоткін, падбіраючы і вылучаючы людзей на тую ці іншую работу, ніякай дапамогі ім не аказвалі, а пасля—за малейшую памылку знімалі з работы.

Таварышы расказалі аб многіх фактах падхалімства ў раёне. У Наўліцкім сельсавеце сакратара райкома Плоткіна на калгасным сходзе выбралі ў ганаровы прэзідыум. Знайшліся і такія людзі, якія заклявалі партрэты раённых кіраўнікоў. Падхалімныя і вочкаўціральскія рапарты пасылалі ў райком па ўсякаму поваду; гэтымі рапартамі запаўнялася раённая газета. У раёне груба парушалася ўнутрыпартыйная дэмакратыя.

Выступаўшыя таксама крытыкавалі небольшэвіцкі стыль кіраўніцтва многіх акруговых работнікаў. Тав. Гавязо расказвае: «Заехаў аднойчы да мяне ў Заскарскі сельсавет загадчык культпропам акругкома партыі Кулікаў, разам з другім сакратаром райкома Федарэнкам. Не вылазячы з машыны, яны запалі мне пытанне: «Расказжы, як справы?» Я адказваю, што справы дрэнныя». «Эх, — не можаш ты кіраваць» — сказалі яны мне, — уключылі газ і паехалі далей».

— У калгас «Чырвоны прымежнік» прыехаў загадчык акрза Грышанаў,—расказвае т. Харытоненка. — Ён выявіў там рад недахопаў, але на месцы ніякіх мер не прыняў, паехаў у Полацк і напісаў дакладную запіску ў акругком партыі.

На сходзе выступіў прысутнічаўшы т. Чарвякоў. Сход прызнаў работу райкома незадавальняючай.

У новы склад райкома было намечана 47 кандыдатур. Кожная з іх дэтальна абмяркоўвалася. Асабліва бурныя спрэчкі выклікала кандыдатура другога сакратара райкома Федарэнкі. Па гэтай кандыдатуры выказалася 25 чалавек. Таварышы ўскрылі многа фактаў грубасці, нячулых адносін і запіску крытыкі з боку т. Федарэнкі. Большасцю 112 галасоў супроць 12 кандыдатура Федарэнкі знімаецца са спіса адкрытым галасаваннем. Была адведзена таксама кандыдатура памочніка дырэктара МТС па палітчасці т. Корбута.

Тайным галасаваннем у склад райкома выбрана 17 чалавек.

Трэба адзначыць, што замест васьмі кандыдатаў у члены райкома большасць галасоў атрымаў толькі адзін чалавек. Тут дапушчан яўны самацёк у кіраўніцтве сходам. Няўжо з 167 членаў партыі ветрынскія комуністы не змаглі знайсці васьмі чалавек, годных быць кандыдатамі ў члены райкома?

***

На першым пленуме райкома тайным галасаваннем выбрана бюро РК у складзе пяці чалавек. Сакратарамі РК КП(б)Б выбраны тт. Плоткін і Міруц — ордэнаносец, начальнік палітаддзела соўгаса «Начаўшпакоўшчына».

ЗАХАПІЛІСЯ „ПОСПЕХАМІ"

Захапіўшыся некаторымі гаспадарчымі поспехамі кіраўнікі Тураўскага раёна супакоіліся і заняліся самаўсхваленнем. Гэта парадзіла ў іх ілыёцкую хваробу — бесклапотнасць. Яны страцілі палітычную чуласць, сталі блізарукімі і не бачылі варожай дзейнасці антысовецкіх людзей ў паасобных калгасах раёна, не зауважвалі грубых скажэнняў падатковай палітыкі, совецкіх законаў у радзе сельсоветаў.

Замест ажыццяўлення палітычнага кіраўніцтва ўсімі галінамі жыцця раёна, райком партыі стаў на шлях падмены совецка-гаспадарчых арганізацый, страціўшы густ да партыйна-масавай работы. Пытанні ўнутрыпартыйнага жыцця, прапаганды і агітацыі былі адсунуты райкомам на задні план, ён адарваўся ад пярвічных партыйных арганізацый і прадпоўных мас.

Члены райкома Шнэйдэрман, Шаршнёў, Бікашоў, Ільянок, Пазоўскі і сам сакратар райкома Дамброўскі ў пярвічных арганізацыях, асабліва ў вясковых, бывалі вельмі мала і таму не ведалі ідэйнага зместу іх работы, не аказвалі ім дапамогі ў палітычным выхаванні комуністаў і беспартыйнага актыву. Інструктары райкомаў Рабіновіч і Міраовіч таксама слаба звязаны з пярвічнымі партарганізацыямі.

Палітагітацыю сярод калгаснікаў, як правіла, праводзяць непадрыхтаваныя таварышы, таму якасць агітацыі вельмі нізкая. Зусім адсутнічае палітмасавая работа сярод аднаасобнікаў. У радзе сельсоветаў Запясонкім, Азяранскім, Танежацкім масавая работа сярод аднаасобнікаў падменьваецца голым адміністраваннем, якое суправаджаецца грубым парушэннем рэволюцыйнай законнасці.

Адсутнасць у партарганізацый вострай крытыкі і самакрытыкі, наяўнасць грубых парушэнняў унутрыпартыйнай дэмакратыі і статута партыі з'явіліся асноўнымі прычынамі ўсіх гэтых недахопаў.

Праверкі работы райкома знізу не было. За цэлы год ён ні разу не адчытваўся перад комуністамі. Справаздачна-выбарчыя сходы пярвічных арганізацый прайшлі пад знакам разгорнутай крытыкі і самакрытыкі, у спрэчках па дакладах сакратароў парткомаў і парторгаў выступалі літаральна ўсе комуністы, якія прысутнічалі на сходах.

Раённы партыйны сход прайшоў на яшчэ большым ідэйным узроўні. Вострая крытыка недахопаў унутрыпартыйнай палітычна-масавай работы была на сходзе высока-прынцыповай. Выступленні комуністаў у спрэчках па справаздачнаму дакладу райкома былі накіраваны на ўскрыццё прычын, якія прывялі да палітычных прарываў у рабоце партарганізацыі.

Вострай крытыцы быў падвергнут старшыня райвыканкома т. Шаршнёў. Аб ім гаварылі, як аб «кіраўніку», які, трацячы ўсякую самастойнасць у рабоце, кожны свой крок узгадняў з сакратаром райкома. Гэта прывяло да апякунства райкома над РВК, да самаўхілення РВК ад кіраўніцтва масавай работай сельсоветаў.

Крытыкавалі і загадчыка сельгасаддзела РК КП(б)Б Шнэйдэрмана за тое, што ён ператварыўся ў галоўнага загатоўшчыка сельгаспрадуктаў. Палітычна-масавая работа ў калгасах, станаўскі рух, кантроль за ажыццяўленнем сталінскага статута яго не датычылі і таму няма нічога дзіўнага, што ён не ведаў сапраўднага становішча гаспадаркі.

Крытыкавалі комуністы і дырэктара МТС тав. Ільянка, рэдактара райгазеты Бікашова і загадчыка аддзела культуры і прапаганды райкома Пазоўскага за дрэнную арганізацыю работы на тых участках, за якія яны адказваюць перад партыяй.

Комуністы ажыўлена абмяркоўвалі кандыдатуры ў новы склад райкома і дэлегатаў на акруговую партканферэнцыю.

ФРАЛОЎ.

Мозыр.

НОВЫ СТРУМЕНЬ У РАБОЦЕ ПАРТКОМА

Сакратар парткома партарганізацыі фабрыкі імя Клары Цэткін (Віцебск) тав. Астроўская толькі што скончыла прыём членскіх узносаў. Хутка ўбраўшы са стала партыйныя дакументы, яна пасцялила ў панчошны цэх. Тут комуністка Рубінштэйн павінна зараз праводзіць палітгутарку. Астроўская жадае прысутнічаць на гутарцы, паглядзець, як яна будзе праводзіцца, выявіць недахопы і дапамагчы палітагітатару іх выправіць. Яна хоча даведацца, якія пытанні хвалююць работніц, як даходзіць да іх палітагітапыя.

Пасля справаздачна-выбарчага партыйнага схода Астроўская сістэматычна прысутнічае на палітгутарках. Гэтаму навучылі яе комуністы, рэзка крытыкаваўшыя на справаздачным сходзе. Яшчэ адзін вывад зрабіў новы партком з выступленняў комуністаў: на правядзенне палітагітапыі вылучаны лепшыя сілы з партыйнага актыва і найбольш падрыхтаваныя. Гутаркі і чыткі газет праводзяцца па цэхах і ўчастках штодзённа. Зараз на фабрыцы глыбока вывучаецца даклад і заключнае слова таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б).

Партком пасля выбараў прыступіў да практычнага выканання рашэння агульнага схода. У спрэчках па дакладу парткома комуністы рэзка крытыкавалі работу фабрычнай шматтыражкі. Газета не мела рабкораўскага актыва, яна не ўзнімала пытанняў, якія хвалююць рабочых, на заметкі ніхто не рэагаваў. Партком на першым-жа пасяджэнні абмеркаваў мерапрыемствы па паляпшэнню работы фабрычнага друку. 18 красавіка партком правёў нараду рабкораў, рэдкалегій насценгазет. Рэдкалегіі рыхтуюцца да справаздач на цэхавых рабочых сходах. У пачатку мая намечана правесці 15-дзённы семінар рэдактароў цэхавых і брыгадных газет.

Выхаванню комуністаў партком аддае вялікую ўвагу. Характэрны прыклад. 10 комуністак партарганізацыі знаходзяцца зараз у дэкрэтыўным водпуску. Партком, улічваючы, што яны не могуць наведваць партыйныя сходы, пасылае да іх на-дом прапагандыстаў, якія праводзяць з імі партыйную вучобу.

Прыкметна паляпшаецца работа са спачуваючымі. З імі арганізавана вывучэнне даклада таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б). Спачуваючыя тт. Бараноўскі і Касуркін вылучаны палітагітатарамі.

Пасля выбараў адчуваецца новы струмень у рабоце парткома. Праўда, ім пакуль зроблены першыя крокі. Далёка не ўсё, аб чым гаварылі комуністы на сходзе, праводзіцца ў жыццё. Зразуміле тое, што гарком партыі пакуль не аказвае новаму парткому ніякай канкрэтнай дапамогі. Пасля выбараў ніхто з работнікаў гаркома не быў у партарганізацыі фабрыкі. У сакратара парткома тав. Астроўскай узнік рад пытанняў, якія без дапамогі гаркома ёй пяжка вырашыць. Але на прапягу двух тыдняў яна не можа дабіцца прыёму ў сакратара гаркома тав. Жураўлёва.

Е. СТОЛІН.
АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

БЕРАГЧЫ ПАРТЫЙНЫ БІЛЕТ

Беражна захоўваць партыйны білет — найпершы абавязак кожнага члена і кандыдата партыі. Аб гэтым неаднаразова напіраджваў Цэнтральны Камітэт нашай партыі. На жаль, многія комуністы яшчэ не пазбавіліся ідыёцкай хваробы — бесклапотнасці, і пралаўжаюць злачынна адносіцца да захавання партыйнага білета.

Так, напрыклад, намеснік начальніка паліталдзела Магілеўскага аддзялення чыгункі тав. Давыдаў па дарозе ў Маскву згубіў у вагоне партыйны білет. Вярнуўшыся ў Магілеў, тав. Давыдаў змаўчаў аб згубе партбілета і звыш трох месяцаў аставаўся намеснікам начальніка паліталдзела, нічога не гаворачы партыйнай арганізацыі. Калі гэта злачынства было выяўлена, сход партыйнай арганізацыі абвясціў Давыдаву вымову.

Член партыі партарганізацыі Гомельскага паравознага дэпо Мухін напіўся п'яным і нават не памятае, хто забраў у яго партыйны білет. Тое самае адбылося з членам гэтай арганізацыі Дзямідавым Грыгорыем. Ён напіўся да такога становішча, што не памятае, дзе быў і якім чынам згубіў партыйны білет.

Загадчык клуба імя Леніна Рудкоўскі паехаў у службовую камандыроўку ў Жлобін. Адтуль ён вярнуўся без партыйнага білета. Білет у яго ўкралі, але хто і дзе—ён не можа ўспомніць. Пры такіх-жа акалічнасцях згубілі свае партыйныя білеты Дудараў (Жлобінская дыстанцыя сувязі), Базан (Унечское паравознае дэпо) і інш.

Звыш дзесятка падобных выпадкаў злачынных адносін да захавання партыйнага білета мелі месца ў гэтым годзе. Партыйныя арганізацыі чыгункі праяўляюць недапушчальную роўнадушнасць і лёгкадумнасць да тых гора-комуністаў, якія хварэюць ідыёцкай хваробай — бесклапотнасцю.

Пералічаныя факты з усёй сур'ёзнасцю паказваюць, што партыйныя арганізацыі чыгункі яшчэ і зараз не засвоілі неаднаразовых рашэнняў ЦК ВКП(б), патрабаваўшых, каб кожны комуніст захоўваў партыйны білет, як зяніцу вока.

А. ГІЗУНТЭРМАН.
Н. СЫРКІН.

ДОБРАЕ ПАЧЫНАННЕ

На ленінскі комсамол большэвіцкая партыя ўскладала адну з важнейшых і ганаровых задач—выхаванне падрастаючага маладога пакалення ў духу комунізму.

Мы, малодыя навуковыя работнікі, бярэм на сябе абавязацельства дапамагчы моладзі г. Менска праз арганізуемы лекторый пры гарадскім камітэце комсамола для папулярызацыі навукі шляхам чыткі лекцый і дакладаў на прадпрыемствах і ва ўстановах, зблізіць нашу моладзь з работнікамі навукі горада, адказваць моладзі на хвалюючыя пытанні сучаснасці.

Дапамога, якую зараз аказваюць моладзі вучоныя гарадоў Масквы, Ленінграда, Кіева і інш., павінна мець свой водгук і сярод вучоных Менска.

Мы спадзяемся, што прыклад вучоных перадавых гарадоў Саюза падтрымаюць вучоныя Менска і гэтым акажуць неацэнную дапамогу нашай моладзі ў пытанні авалодання марксісцка-ленінскай тэорыяй.

ШУЛЯКОЎСКІ, ЛОЧМЕЛЬ, ШЛОСБЕРГ.

За рубяжом

ГОРКІЯ ПЛАДЫ ШКОДНАЙ ПАЛІТЫКІ

Апошнія падзеі на міжнароднай арэне яшчэ раз пацвярджаюць, якія горкія плады дае палітыка непраціўлення агрэсарам. Гэтыя падзеі ярка дэманструюць той факт, што фашысцкія палпальшчыкі вайны адступаюць толькі перад сілай: малейшы спірт, заігрыванне з фашысцкімі дзяржавамі, малейшая ўступка агрэсарам, адступленне ад барацьбы за сістэму калектыўнай безапаснасці — пабуджаюць Германію і Італію да новых парушэнняў асноў міжнароднага права, да новых разбойнічых подвігаў.

У газетах апублікаван тэкст англа-французскай дэкларацыі, перададзенай бельгійскаму міністру замежных спраў. У гэтай дэкларацыі ўрады Францыі і Англіі заяўляюць, што яны лічаць пяпер Бельгію свабоднай ад усіх абавязацельстваў па ўзаемнаму гарантаванню безапаснасці, якія выцякаюць з лакарнскага дагавору. У той-жа час Англія і Францыя захоўваюць за сабой прынятыя на сябе абавязацельствы па аказанню дапамогі Бельгіі ў выпадку нападу. Абодвы ўрады прыймаюць да ведама вернасць Бельгіі Лізе нацый.

Такім чынам, нейтралітэт Бельгіі ў выпадку вайны, якога так дабіваўся бельгійскі ўрад, стаў фактам. Фашысцкая Германія запалохала бельгійскую буржуазію і штурхнула яе на пазіцыі нейтралітэта, на пазіцыі адмовы ад дапамогі ранейшым саюзнікам. Малая краіна, няўпэўненая ў абароне з боку вялікіх дзяржаў, збілася з ранейшага шляху, мяркуючы, што палітыкай угодніцтва ў адносінах да агрэсара яна дабіецца літасці.

Зусім зразумела, што абяззбройванне Бельгіі, нейтралітэт яе — поўнасцю на інтарэсах фашысцкай Германіі. Толькі наіўныя людзі і яўныя дурні могуць паверыць байкам і абяцанням Гітлера паважаць нейтралітэт Бельгіі.

Такім чынам, Англія і Францыя нейтралітэтам Бельгіі расплачваюцца за дапушчаны ў мінулым годзе беспакараны разрыў лакарнскага дагавору.

Трывогу ўнушаюць рэзультаты сустрэчы ў Венецыі кіраўнікоў Італіі і Аўстрыі — Мусаліні і Шушніга. У апублікаваным паведамленні аб сустрэчы італьянскага і аўстрыйскага дзяржаўных дзеячоў няма ні слова аб неабходнасці захавання незалежнасці Аўстрыі, аб гарантаванні гэтай незалежнасці. Італія, якая ўвесь час стаяла на варце незалежнасці Аўстрыі, абараняла яе ад пагрозы германскага «аншлюса» (далучэння да Германіі), цяпер сваімі рукамі рые магілу аўстрыйскай дзяржаўнасці. Дружба Італіі з Германіяй зайшла так далёка, што Мусаліні прымушан адмовіцца ад краявугольнага камня сваёй знешняй палітыкі — захавання аўстрыйскай дзяржавы. Аўстрыя, такім чынам, уключаецца ў славутую вось «Рым-Берлін», і гэтым паскараецца паглынанне яе фашысцкай Германіяй.

Фашысцкая Італія ідзе ўсё больш і больш на поваду ў Гітлера. У гэтым—сэнс перагавораў у Венецыі. І вось чаму германскі друк з такім задавальненнем сустрэў рэзультаты перагавораў Мусаліні і Шушніга.

Канферэнцыя лонданскіх комуністаў

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 26 красавіка. (БЕЛТА). Адбылася штогодняя канферэнцыя лонданскай арганізацыі компартыі. На ёй былі агалошаны даныя аб колькасці лонданскай арганізацыі і аб тыражы органа компартыі «Дэйлі Уоркер». За мінулы год лік членаў лонданскай арганізацыі компартыі павялічыўся з 2.300 да 5.000 чалавек. Тыраж «Дэйлі Уоркер» падвоіўся.

Найбольшая ўвага на канферэнцыі ўдзялялася тром асноўным пытанням: адзінству рабочага руху, уздыму стачачнага руху падзеям у Іспаніі.

Комуністычны дэпутат парламента Гэлахер, які вярнуўся нядаўна з Іспаніі, перадаў канферэнцыі прывітанне ад інтэрнацыянальнай брыгады.

На канферэнцыі была ўхвалена праграма мерапрыемстваў па вярбоўцы новых членаў, па аказанню падтрымання баставым аўтобусным рабочым, па арганізацыі барацьбы за павышэнне зарплаты, падрыхтоўцы да 1 мая і т. д.

Фашысцкая артылерыя зноў бамбардыруе Мадрыд

МАДРЫД, 26 красавіка, (БЕЛТА). Фашысты зрабілі сутачны перапынак у бамбардыроўцы Мадрыда ў сувязі з удачнымі нападаннямі рэспубліканскай артылерыі на батарэях мяцежнікаў і дрэннай бачнасці. Учора фашысцкія батарэі перамянілі пазіцыі і, пачынаючы з 15 з паловай гадзін, паслалі ў Мадрыд 32 снарады, якімі было забіта 5 чалавек і ранена каля 10.

Сёння бамбардыроўка пачалася з 12 гадзін і цягнулася з вялікай інтэнсіўнасцю. Прамежкі паміж разрывамі снарадаў — 2 — 3 мінуты. Фашысты страляюць 75-міліметравымі брызантнымі снарадамі, начыненымі кардытам і прадназначанымі не для разбурэння будынкаў, а для маральнага знішчэння людзей, а таксама 150-міліметравымі фугаснымі снарадамі.

Парваныя трамвайныя правады папраляюцца неадкладна, не гледзячы на бамбардыроўку. Насельніцтва захоўвае ны спакой, аднак на вуліцах народу вельмі мала і прахожыя ідуць паскораным крокам.

Заклік рэспубліканскіх афіцэраў да мяцежніка

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 26 красавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Эспань перадае, што ўпершыню з пачатку мяцежу рэспубліканскія афіцэры звярнуліся да мяцежных афіцэраў з непасрэдным заклікам перайсці на бок рэспублікі. Сярод падпісаўшых гэты заклік — генерал Міяха. Рэспубліканскія афіцэры падкрэсліваюць факт інтэрвенцыі ў Іспаніі і заяўляюць, што толькі тыя афіцэры, якія не хочуць каб Іспанія стала калоніяй Германіі і Італіі, з'яўляюцца сапраўднымі патрыётамі.

Рэспубліканскія камандзіры прапануюць мяцежным афіцэрам далучыцца да рэспубліканцаў у барацьбе супроць іншаземных інтэрвентаў.

Морскі бой ля берагоў Іспаніі

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 26 красавіка. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Рэйтэр, каля ўсходняга ўзбярэжжа Іспаніі, у Міжземным моры, адбыўся бой паміж урадавымі эскадраннымі мінаносцамі і крэйсерамі мяцежнікаў «Канарыяс» і «Балеарэс».

***

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 26 красавіка. (БЕЛТА). Міністэрства морскага флота і авіяцыі Іспаніі апублікавала паведамленне, у якім гаворыцца, што англійскае нафтаналіўное судно ўчора два разы было спынена ў раёне Барселоны італьянскімі мінцам. Як указваецца ў паведамленні, калі з'явіліся ўрадавыя самалёты, італьянскі эсмінец ўдаліўся, але калі самалёты схаваліся, эсмінец зноў папрабаваў затрымаць судно, якому ўсё-ж удалося шчасліва прыбыць у Барселону.

НАПЯРЭДАДНІ 1 МАЯ

СВЯТА ПРАЦЫ І ПРОЛЕТАРСКАЙ САЛІДАРНАСЦІ

У дзень 1 Мая гэтага года пролетарыяты капіталістычных краін адзіным антыфашысцкім фронтам будуць дэманстраваць міжнародную салідарнасць пад лозунгамі барацьбы супроць фашызма, супроць вайны, за мір, за дэмакратыю, за сацыялізм. Пролетарыі будуць дэманстраваць бязмежную любоў і адданасць да Совецкага Саюза — бацькаўшчыны ўсяго свету. Пролетарыі ўсюды будуць дэманстраваць міжнародную салідарнасць з гераічным іспанскім народам, які змагаецца супроць аб'яднаных сіл іспанскага і германа-італьянскага фашызма.

У Совецкім Саюзе на першамайскім свяце працоўныя будуць праносіць лозунгі аб вялікіх заваяваннях краіны сацыялізма, запісаных у гістарычным дакуменце — Сталінскай Канстытуцыі, лозунгі, якія заклікаюць да далейшай барацьбы за комунізм.

Уся магутнасць — палітычная, ваенная, гаспадарчая і культурная — перамогшага сацыялізма служыць справе захавання міру. У Канстытуцыі знайшла выражэнне тая мудрая сталінская палітыка, якая за апошнія гады асабліва моцна ўплывала на міжнародную абстаноўку ў інтарэсах захавання міру, г. зн. у інтарэсах мільёнаў працоўных, у інтарэсах народаў усіх краін.

Канстытуцыя Краіны Совэтаў з'яўляецца магутнай зброяй у руках шчырых прыхільнікаў міру, іх баявой праграмай.

Фашызм з яго чалавеканенавісніцтвам, з яго звярыным нацыяналізмам вядзе да войн і выражэння народаў.

Сацыялізм — гэта росквіт матэрыяльнага і культурнага жыцця народаў, гэта дружба і брацтва паміж народамі, сацыялізм — гэта мір. Краіна сацыялізма — галоўны фактар міру.

Амаль два гады назад, на VII кангрэсе Комуністычнага Інтэрнацыянала, таварыш Дзімітраў указаў, што перагарадзіць дарогу фашызму, адбіць наступленне капітала, перашкодзіць імперыялістычнай вайне, можна будзе, ажыццявіўшы адзіны фронт працоўных у нацыянальным і міжнародным маштабе. Таварыш Дзімітраў кінуў пролетарыям усяго свету баявы кліч: **адзінства дзеянняў супроць фашызма, супроць наступлення капітала, супроць пагрозы імперыялістычнай вайны.**

Станоўчы вопыт прымянення тактыкі адзінага фронта мае міжнароднае значэнне. Бліскучы прыклад народнага фронта ва Францыі і Іспаніі ўжо зараз аказвае велізарны ўплыў на працоўных усіх краін, у тым ліку на пролетарыяў, якія знаходзяцца пад ярмом фашызма. Гэты вопыт дае непераможную зброю прыхільнікам адзінства дзеянняў ва ўсіх краінах.

Фашызм шукае ў вайне выхаду з тых капіталістычных супярэчнасцей, якія яму не толькі не ўдалося вырашыць, але якія ён сваёй палітыкай вайны і бязлітаснага задушэння працоўных мас яшчэ больш павялічыў. Трацкісты — гэтыя шпіёны, шкоднікі, дыверсанты і забойцы — выконваюць усе разбойніцкія заданні сваіх фашысцкіх гаспадароў. У прыватнасці, трацкісты ўсімі сродкамі вядуць актыўную барацьбу супроць народнага фронта ва Францыі, Іспаніі і ў іншых краінах. Правыя рэстаўратары капіталізма з'яўляюцца вярнымі саюзнікамі трацкісцкай агентуры фашызма ва ўсіх варожых пролетарыяту дзеяннях.

Прайшоўшы год быў годам уздыму сусветнага рабочага руху. Перамог народны фронт ва Францыі, дзе партыі народнага фронта ў маі 1936 года сабралі 5.628 тыс. галасоў і атрымалі 379 мандатаў, а комуністычная партыя вышла з найбольшым поспехам з гэтай кампаніі (1,5 мільёна галасоў у 1936 годзе супроць 800 тыс. у 1932 г.).

У Злучаных Штатах Амерыкі падняла ся высокая стачачная хваля, прычым рабочыя сталі пераходзіць да актыўных дзеянняў, аж да заняцця прадпрыемстваў. 150 тыс. рабочых аўтамабільных заводаў «Джэнерал моторс» дабіліся перамогі, прымусіўшы гэты магутны трэст падпісаць згоду з профсаюзам. Стальны трэст ЗША (200 тыс. рабочых) ужо без стачкі рабочых вымушан быў, пад націскам агульнага непераможнага стачачнага руху, падпісаць дагавор з саюзам сталеліцейшчыкаў.

Нават ва ўмовах шалёнага фашысцкага тэрору ў Германіі глыбокае незадаволэнне рабочых і працоўных мас усё часцей і часцей пачынае прарывацца на паверхню. Самым шырокім масам ва ўсім свеце становіцца ясна, што фашызм, асабліва германскі і італьянскі, — галоўны падпальшчык вайны, што адзінства ўсіх сіл міру ёсць адно з галоўных звенняў у барацьбе супроць фашызма.

Рух супроць небяспекі вайны стаіць у цэнтры ўвагі народаў усяго свету. «Вайна можа выбухнуць нечакана. Цяпер войны не абвяшчаюцца. Яны проста пачынаюцца» (І. Сталін). Гэта вымагае яснага разумення размеру і характару ваеннай небяспекі, сіл міру, сродкаў і шляхаў барацьбы за мір.

Рашаючым фактарам міру, свабоды і незалежнасці народаў з'яўляецца вялікі Совецкі Саюз.

У далёкіх каланіяльных і поўкаланіяльных краінах згуртоўваецца самы шырокі нацыянальны фронт вызваленчага руху. Пад уплывам японскай агрэсіі ўзнімаецца агульнанародная антыяпонская вайна у Кітаі. Шырока разгарнулася дзейнасць антыяпонскай «асацыяцыі выратавання радзімы». Лозунг комуністычнай партыі Кітая — барацьба за дэмакратычную рэспубліку, адпор японскай агрэсіі, скліканне на аснове ўсеагульных выбараў усекітайскага парламента — прыцягвае ўсё большае спачуванне самых шырокіх народных мас Кітая.

Так на аснове рашэнняў VII кангрэса Комінтэрна мацнеюць і растуць сілы фронта міру, сілы адзінага антыімперыялістычнага і антыфашысцкага народнага фронта.

Цяперашняя маёўка адбываецца ў 20-ю гадавіну Вялікай пролетарскай рэволюцыі. У совецкай краіне 1 мая праходзіць пад знакам мабілізацыі рабочых мас і ўсіх працоўных на барацьбу за далейшае ўмацаванне дыктатуры пролетарыята, за новыя перамогі сацыялізма.

За гістарычна мінімальны тэрмін мы вырашылі пытанне «хто каго», канчаткова і беспаваротна. Няма ўжо ў нашай краіне капіталістычных класаў. Яны ліквідаваны. Грамадская, сацыялістычная ўласнасць усверджана, як непахісная аснова совецкага ладу. Уся народная гаспадарка ўзнята на небывалую вышыню.

Ленін у сваім прывітанні да венгерскіх рабочых пісаў:

> **«Галоўная сутнасць яе (дыктатуры пролетарыята — Рэд.) у арганізаванасці і дысцыплінаванасці перадавога атрада працоўных, яго авангарда, яго адзінага кіраўніка, — пролетарыята. Яго мэта — стварыць сацыялізм, знішчыць падзел грамадства на класы, зрабіць усіх членаў грамадства працоўнымі, адабраць глебу ва ўсякай эксплаатацыі чалавека чалавекам»** (Ленін, Творы, т. XXIV, стар. 314).

Гэта найвялікшая гістарычная задача ў асноўным ажыццёўлена ў нашай краіне. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ў асноўным **пабудован сацыялізм.**

Совецкі Саюз — магутная, тэхнічна перадавая, індустрыяльная дзяржава. Пераможныя вынікі 1936 года вызначаюцца, перш за ўсё, разгарнуўшымся стаханаўскім рухам, які стварае ўсе ўмовы для пераходу ад сацыялізма к комунізму.

Падкрэсліваючы велізарную значымасць выканання і перавыканання нашых народнагаспадарчых планаў, мы ў той-жа час павінны цвёрда памятаць словы таварыша Сталіна:

> **«Па-першае, даказана, што ўсе нашы гаспадарчыя планы з'яўляюцца заніжанымі, бо яны не ўлічваюць велізарных рэзерваў і магчымасцей, якія толпяцца ў нетрах нашай народнай гаспадаркі.**
>
> **Па-другое, сумаркае выкананне гаспадарчых планаў па наркаматах у цэлым яшчэ не значыць, што па некаторых вельмі важных галінах таксама выконваюцца планы. Назавуць, фанты гаворыць, што цэлы рад наркаматаў, выканаўшых і нават перавыканаўшых гадавыя гаспадарчыя планы, сістэматычна не выконвае планаў па некаторых вельмі важных галінах народнай гаспадаркі».**

Гэта цалкам пацвярджаецца ўсёй практыкай работы ў 1936 годзе. 1937 год павінен стаць годам рашучага зжыцця ўсіх тых недахопаў, якія выявіліся ў 1936 годзе.

План 1937 года — гэта план далейшага росту нашай гаспадаркі і ўмацавання абаронаай магутнасці краіны. Прадукцыя буйнай прамысловасці ў 1937 годзе павінна павялічыцца на 16,7 мільярдаў рублёў, або на 20 проц. у адносінах да 1936 года. Сельская гаспадарка Совецкага Саюза павінна сабрацъ у 1937 годзе звыш 6,6 мільярдаў пудоў зернавых культур, больш 46,1 мільёна пудоў бавоўны-валакна. Гэтыя заданні больш высокія, чым тыя, якія былі ўстаноўлены другім пяцігадовым планам, сельская гаспадарка будзе выконваць ва ўмовах узрослай механізацыі. Магутнасць трактарнага парка ў 1937 годзе павялічваецца на 18 проц. і дойдзе к канцу 1937 года да 9,4 мільёна конскіх сіл.

Разам з гэтым пашыраецца работа чыгуначнага і іншых відаў транспарта, расце капітальнае будаўніцтва, узрастае тавараабарот, умацоўваецца совецкі рубель.

Вялікія поспехі нашай краіны, але яшчэ больш грандыёзны задачы, якія стаяць перад барацьбітамі нашай міжнароднага пролетарыята. Адна з рашаючых задач 1937 года — **да канца выкарчаваць шкоднікі, элементы скрозь і ўсюды, стварыць станоўку, якая выключыла-б магчымасць варожай дзейнасці здрадніцкіх радзімы.**

Таварыш Сталін у дакладзе і ў заключным слове на Пленуме ЦК ВКП(б) сфармуляваў важнейшыя задачы, якія стаяць перад нашай краінай. Перш за ўсё, трэба заўсёды памятаць, што мы жывем у капіталістычным акружэнні, што совецкая ўлада перамагла толькі на адной шостай частцы земнага шара.

Рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) — гэта баявая праграма барацьбы нашай партыі і ўсяго совецкага народу за далейшае вышэнне магутнасці Совецкага Саюза. Выканаць дырэктывы Пленума ЦК ВКП(б) на справе — гэта азначае, перш за ўсё вастрэй і вастрэй адточваць рэволюцыйную пільнасць, зоркасць і насцярожанасць да заклятых ворагаў народу, трацкісцкіх, бухарынскіх і іншых наймітаў фашызма, да шкоднікаў, дыверсантаў, шпіёнаў, засылаемых у СССР капіталістычным акружэннем.

Партыя зараз высунула новы лозунг, які дапаўняе стары лозунг авалодання тэхнікай — лозунг **палітычнага выхавання кадраў, авалодання большэвізмам і ліквідацыі нашай палітычнай даверлівасці, бясклопатнасці.** Пытанне аб большэвіцкім выхаванні кадраў, аб авалоданні большэвізмам — зараз самая важная задача ўсіх партыйных арганізацый.

Ажыццяўленне Сталінскай Канстытуцыі азначае ўзмацненне палітычнай актыўнасці мас, уцягненне новых слаёў працоўных у кіраванне дзяржавай, узмацненне кантролю мас у адносінах совецкіх органаў, узмацненне адказнасці совецкіх і партыйных арганізацый. Новая выбарная сістэма яшчэ больш умацуе сувязь народа з партыяй, дасць новы магутны штуршок да паляпшэння работы ўсіх партыйных і совецкіх арганізацый.

Першае мая ў гэтым годзе пройдзе пад знакам ажыццяўлення найвялікшых задач, пастаўленых Пленумам ЦК нашай партыі і выцякаючых са Сталінскай Канстытуцыі СССР.

Л. РЖАНАЎ.

НОВЫ АТРАД ЖАНЧЫН-КАМБАЙНЕРАК

ЗАМАЦАВАЦЬ АТРЫМАНЫЯ ВЕДЫ

Сёння заканчваюць работу 8-месячныя курсы трактарыстак-камбайнерак пры Беларускай навукова-даследчай станцыі мэханізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. 99 дзяўчат-калгасніц атрымаюць ганаровае званне трактарыстак-камбайнерак. З іх скончыўшых на «выдатна» па трактарах і камбайнах 42 чал., на «добра» — 37 чал., на «здавальняюча» — 20 чалавек.

Падрыхтоўка трактарыстак-камбайнерак не абмежавалася асваеннем тэхнічных дысцыплін. Палітычнаму выхаванню і агульна-культурнаму развіццю курсантак была адведзена не меншая ўвага, чым тэхнічнай падрыхтоўцы. Апрача прахаджэння дысцыплін па палітыцы партыі ў вёсцы, роднай мовы, арыфметыкі і агратэхнікі, прадугледжаных праграмай курсаў, курсанткі займаліся ў гуртках па вывучэнню гісторыі партыі, пытанняў бягучай палітыкі.

Сталінская Канстытуцыя, статут сельскагаспадарчай арцелі, даклад і заключнае слова таварыша **Сталіна** на апошнім Пленуме ЦК ВКП(б) — былі пакладзены ў аснову палітычнага выхавання курсантак. Выпускныя экзамены паказалі высокую палітычную падрыхтоўку трактарыстак-камбайнерак. Дастаткова ўказаць на тое, што па палітыцы 26 курсантак здалі іспыты на «выдатна»; 44 — на «добра», 29 — на «здавальняюча».

Непазнавальна вырасла палітычная свядомасць, іх актыўны ўдзел у грамадска-палітычнай рабоце. З 22 комсамолак, якія прыбылі на курсы; комсамольская арганізацыя да скančвання курсаў вырасла да 59 чалавек. Усе 99 курсантак здалі норму на значок «ГСО».

Наша партыя і совецкі ўрад прадаставілі ўсе ўмовы для вучобы калгасніцам-камбайнерам. Дзякуючы клопатам аб людзях з боку партыі Леніна — Сталіна ствараюцца новыя кадры — людзі новых прафесій калгаснай вёскі, якія авалодалі тэхнікай і большэвізмам. Курсы далі 99 жанчын камбайнерак-трактарыстак з высокай тэхнічнай і палітычнай падрыхтоўкай.

Узяць, напрыклад, выпускніцу-камбайнерку Шарко Ольгу Канстанцінаўну з калгаса «Чырвоны будаўнік», Менскага раёна. Яна здала ўсе дысцыпліны на «выдатна», актыўна дапамагала ў працэсе вучобы адстаючым курсанткам. Або вось Мандрукевіч Екацерына Андрэеўна — ордэнаноска-комсамолка з калгаса «Звязда», Заслаўскага раёна, якая здала ўсе дысцыпліны на «выдатна», актыўна ўдзельнічала ў грамадскай рабоце, была рэдактарам насценнай газеты курсаў.

Выдатніцамі вучобы з'яўляюцца таксама Марцінкевіч Станіслава з калгаса імя Кірава, Крупскага раёна, Вайцэховіч Соф'я з калгаса «Чырвоны баец», Дзержынскага раёна, Валодзькіна Ольга, Маліноўская Марыя, Кароль Марыя, Думанская Надзежда, Падабед О., Куніцкая К., Васілевіч О., Павіч А., Трэцякова М., Плашчынская В., Прыбава В., Грынкевіч Н.

Але добрыя рэзультаты вучобы — гэта толькі першае заваяванне маладых трактарыстак-камбайнерак. Другая частка — гэта практычная работа на трактары і камбайне.

Для таго, каб даць стаханаўскія нормы выпрацоўкі, кожная трактарыстка-камбайнерка павінна памятаць, што поспех яе работы будзе залежаць перш за ўсё ад арганізацыі работы. Падрыхтоўка ўчасткаў, машын, арганізацыя работы людзей свайго агрэгата, любоўныя адносіны да людзей і машын, быць пільнымі і распазнаваць ворага, каб вораг не нашкодзіў рабоце машын, — гэта асноўная ўмова паспяховай работы камбайнераў.

МАЦЭПУРА.

Дырэктар Беларускай станцыі мэханізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

99 лепшых дзяўчат-калгасніц паспяхова скончылі вучобу на васьмімесячных курсах трактарыстаў і камбайнераў. НА ЗДЫМКУ: група курсантак, якія ўсе прадметы здалі на «выдатна». У першым радзе (злева направа): тт. С. Куніцкая, Е. Мандрукевіч, В. Плашчынская; у другім радзе (злева направа): О. Валодзькіна, Н. Думанская, М. Кароль. В. Прыбава; у трэцім радзе (злева направа): Н. Грынкевіч і Р. Вітноўская.

Фото Я. Салавейчыка.

УБЯРУ НЕ МЕНШ ТЫСЯЧЫ ГЕКТАРАЎ

Калі ў мінулым годзе мяне першы раз пасылалі на курсы камбайнерак, некаторыя калгаснікі гаварылі:

— Не жаночая гэта праца. На камбайне толькі мужчынам працаваць.

Я на гэта не звяртала ўвагі. Добра ведала, што з нас, совецкіх жанчын, ёсць многа лётчыкаў, парашутыстак, інжынераў, якія даюць прыклады мужнасці і гэройства. Сама-ж таксама мела рэкорды на апрацоўцы ільну. За дзень натропвала ўручную па 85 кілаграмаў ільнавалакна. За гэта мела гонар быць у Маскве на ўсесаюзнай нарадзе перадавікоў па ільну і канаплях, бачыць дарагога правадыра таварыша **Сталіна** і атрымаць ад саюзнага ўрада вышэйшую ўзнагароду — ордэн «Знак почета».

А вучыцца на камбайнера мне вельмі хацелася. Вучыцца — гэта значыць авладаць тэхнікай, значыць дапамагчы краіне выканаць лозунг дарагога правадыра — даць у бліжэйшым будучым 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

Адно толькі непакоіла мяне: як я здолею вывучыць камбайн, бо веды мае былі зусім мізэрныя—скончыла ўсяго тры класы. Думалася, што адстану. Але палахлівасць гэту хутка перамагла. 27 сакавіка мінулага года паехала на курсы камбайнераў у Горкі. Там вучылася чатыры месяцы. Скончыла на «выдатна» і атрымала годнасць памочніка камбайнера.

Пасля курсаў, разам з камбайнерам Маеўскім Янкам, працавала ў сваім раёне на паўночным камбайне. Хаця на ўборку азімых спазніліся і ўбіралі толькі яравыя, норму перавыканалі. Убралі за няпоўны сезон 130 гектараў, замест нормы ў 80 гектараў.

Калгаснікі не адыходзілі ад камбайна—дзівіліся, як хутка і чыста жне і тут-жа малоціць такая машына. Развеялася іх думка, што на камбайне жанчына працаваць не можа.

Як скончылі ўборку, мяне ў другі раз паслалі на курсы камбайнераў, у Менск. Тут вучылася ўжо восем месяцаў. За гэты час яшчэ больш аўладала машынай, і скончыла курсы на «выдатна». Сёлета буду працаваць камбайнерам самастойна. Абавязваюся ўбраць паўднёвым камбайнам не менш тысячы гектараў. І выканаю гэта з гонарам.

Е. А. МАНДРУКЕВІЧ.

Ордэнаноска-камбайнерка калгаса «Звязда», Заслаўскага раёна.

У СПАБОРНІЦТВЕ ВЫШЛІ ВЫДАТНІЦАМІ

Сярод маладых камбайнэрак-комсамолак я адна са старэйшых. Мне 30 год, я — кандыдат КП(б)Б. Да гэтага часу працавала ў калгасе старшынёй, загадчыцай фермы.

Летась Янушкаўская МТС паслала мяне вучыцца на курсы камбайнераў-трактарыстаў. Я з вялікім энтузіязмам прынялася за вучобу. Усе восем месяцаў большасць часу праводзіла ля машын. Прыехала на курсы малапісьменнай, ледзь умела распісацца, зараз адчуваю сябе зусім граматнай не толькі ў ведамі сельскагаспадарчых машын, але і па іншых дысцыплінах.

Па вучобе, па авалоданню камбайнам і астатнімі машынамі я спаборнічала з курсанткай Кароль Марусяй. У спаборніцтве мы абедзве вышлі выдатніцамі, атрымалі высокае званне камбайнэрак-трактарыстак.

Яшчэ больш разгорнецца сацыялістычнае спаборніцтва, калі мы прыступім да работы. Буду ўпарта змагацца за перавыкананне нормы, за высокаякасную ўборку ўраджаю. На паўночным камбайне дам за сезон не менш 200 гектараў супроць нормы 80 гектараў.

Камбайнерка ДУМАНСКАЯ Надзежда.

Калгасніца арцелі «Іскра», Лагойскага раёна.

ЗБЫЛАСЯ МАЯ МАРА

Да курсаў я зусім не ведала трактара і ніколі не бачыла камбайна. Але я чула, што хутка на нашых калгасных палях будзе працаваць гэта складаная машына. У сваім калгасе я працавала на ўсіх работах, была ўдарніцай і марыла аб камбайне.

І вось мяне, як лепшую калгасніцу-ўдарніцу Бягомльская МТС накіроўвае ў Менск на курсы камбайнерак.

Спачатку было пяжкавата: не ведала, як падыйсці да машыны. Але мяне гэта не спужала. «Хіба я — калгасніца, не магу авалодаць такой машынай?», — падумала сама сабе. Уся аддалася вучобе, бо расло жаданне вывучыць камбайн і трактар, працаваць на гэтых машынах. За восем месяцаў я вывучыла кожны вінцік, кожную часць складанай машыны і магу без дакораў працаваць на ёй. Іспыты па камбайну і трактару, а таксама па ўсіх астатніх дысцыплінах здала на «выдатна».

Выдатніцай буду і на калгасных палях. За сёлетні сезон убіраю на паўночным камбайне не менш 200 гектараў.

Я дзякую дарагой комуністычнай партыі і асабіста роднаму баньку таварышу **Сталіну**, якія далі мне магчымасць асвоіць такую складаную машыну, як камбайн.

Камбайнерка КАРОЛЬ Маруся.

Калгасніца арцелі імя Будзённага, Бягомльскага раёна.

МТС НЕ ПАВІННА ЗАБЫВАЦЬ НА НАС

Я адна з маладзейшых курсантак-камбайнерак, мне толькі 17 год. Мае бацькі ніколі не спадзяваліся, што іх дачка ў такіх гадах вывучыць гэтакую складаную машыну, якой яны да калгаса не бачылі ў вочы.

Перад выпускам з курсаў былі ў пісьме наказвалі мне: «Глядзі, добра здай экзамен, каб не чырванець нам, старым. Прыязджай у калгас камбайнеркай».

Іх надзея збылася. Курсы я скончила на «выдатна», добра авалодала камбайнам і трактарам. Я — камбайнерка. Гэта вялікая для мяне, маладой дзяўчыны, радасць. На курсах я многа чаго атрымала, тут-жа ўступіла ў комсамол. Зараз я з нецярпеннем чакаю тае пары, калі буду на машыне ўбіраць багаты калгасны ўраджай. А працаваць буду таксама на «выдатна», як і вучылася на курсах.

У сваёй рабоце я патрабую дапамогі ад дырэкцыі МТС. Па-першае, мне павінны дапамагчы загадзя падабраць добрыя ўчасткі для работы камбайна. Ад гэтага будзе залежаць поспех маёй работы. А мы не пашкодуем сіл, на сталінскіх машынах пакажам сапраўды стаханаўскія метады работы.

Камбайнерка МАРЦІНКЕВІЧ Станіслава.

Калгасніца сельскагаспадарчай арцелі імя Кірава, Крупскага раёна.

ЗАБЫЛІСЯ ПРА ПЕРШАЧАРГОВУЮ ЗАДАЧУ

МАГІЛЕЎ. (Спец. кар. «Звязды»). Старшыня горсовета тав. Анісімаў рэкамендуе дэпутацкую групу скурзавода імя Сталіна, як адну з лепшых. Колькі-ж усяго лепшых? Тав. Анісімаў змог назваць толькі 2, астатнія групы, відаць, няма за што хваліць.

У дэпутацкай групе скурзавода 7 членаў горсовета. Яны працуюць параўнаўча нядрэнна, здолелі ў апошні час згуртаваць вакол сябе актыў у 60 чал. Няма, бадай, ніводнага рабочага, які-б не ведаў, напрыклад, дэпутата горсовета Валі Чуміс. Валя — стаханаўка-футамершчыца сырамятнага пэха. Тут і яшчэ ў дубным цэху яна ажыццяўляе кантрольны пост дэпутацкай групы. Яе задача, як і ўсіх кантрольных пастоў у іншых пэхах, наглядаць за выкананнем плана, за якасцю прадукцыі. Аб малейшых непаладках на вытворчасці Валя зараз-жа сігналізуе Нядаўна быў такі выпадак: у сырамятны цэх паступіла партыя ялавай сырамяці, прынятая заводам за першагатункавую. У сырамяці было шмат дэфектаў, якіх не заўважыў ні прыёмшчык, ні бракер пэха. Выявіла гэта тав. Чуміс. Яна неадкладна паведаміла начальніку пэха, указала яму на дэфекты. Быў складзен акт, і сыравіна была прызнана нягоднай для выпрацоўкі з яе першагатункавай прадукцыі.

Вялікую ўвагу ўдзяляе дэпутацкая група культурна-бытавому абслугоўванню рабочых. Вось, напрыклад, пытанні, абмеркаваныя на пасяджэнні групы 13 красавіка г. г.: 1) Вывады камісіі па разліках за ацяпленне рабочага пасёлка; 2) Аб дзіцячай пляцоўцы пры пасёлку; 3) Аб гатоўнасці да сяўбы індывідуальных агародаў.

Усё гэта добра. Пытанні важныя і актуальныя, але ёсць адзін велізарны недахоп у рабоце групы: яна не змагаецца за выкананне непасрэднага наказу сваіх выбаршчыкаў. У 1934 годзе пры выбарах дэпутатаў калектыў рабочых скурзавода ўнёс 19 дадаткаў да наказа горсовету. З гэтых 19 дадаткаў выканана толькі 5. У лютым мінулага года ў рэзалюцыі па справаздачы дэпутатаў горсовета рабочыя скурзавода зусім правільна выказалі сваё нездавальненне тым, што «да гэтага часу не заасфальтаваны тратуары па Быхаўскай вуліцы, якая вядзе да завода, не палепшан аўтобусны рух, не ўстаноўлена воданапорная будка і не пабудавана лазня на Лупалаве, у магазінах няма кантрольных вагаў».

Прайшло больш года, але каб сёння ізноў рабочыя заслухалі справаздачу дэпутацкай групы, яны, несумненна, запісалі-б у рэзалюцыі тое-ж самае. Бо ўсе дадаткі да наказу асталіся нявыкананымі і да гэтага часу. Не ажыццёўлены і іншыя пункты наказу.

Дэпутацкая група забылася, што іменна барацьба за поўнае ажыццяўленне наказу сваіх выбаршчыкаў з'яўляецца не першачарговым абавязкам. Старшыня дэпутацкай групы тав. Яро прызнае:

— Мы не былі настойлівы, не ставілі перад прэзідыумам горсовета гэтых пытанняў.

Справядлівасць, аднак, патрабуе адзначыць, што за адзін пункт наказу дэпутацкая група вяла пэўную барацьбу. Гутарка ідзе аб паляпшэнні аўтобуснага руху ў рабочым раёне, але тут выключны бюракратызм, бездапаможнасць праяўляе горсовет. Справа ў тым, што ў рабочым раёне, дзе сканцэнтраваны буйнейшыя прадпрыемствы (шаўковая фабрыка, скурзавод імя Сталіна, хлебазавод), курсіруюць усяго тры аўтобусы, якія належаць шаўковай фабрыцы. Яны ніяк не могуць абслугоўваць усіх рабочых і насельніцтва раёна. У выніку каля астановак аўтобуса вялікія чаргі, нярэдкі выпадкі, калі рабочыя спазняюцца на работу. Дэпутацкая група скурзавода ставіла пытанне перад прэзідыумам горсовета аб неабходнасці павялічыць лік аўтобусаў, якія курсіруюць у раёне завода. Але горсовет ніяк не можа ўзгадзіць на магілеўскае аддзяленне Белдзяржтранса, якое лічыцца толькі з камерцыйнымі інтарэсамі. Яму, бачыце, зручней, каб усе аўтобусы курсіравалі толькі ў цэнтры горада, а не на ўскраінах.

Калі напамінкі прэзідыума горсовета не дапамаглі, старшыня дэпутацкай групы тав. Яро напісаў у раённую газету аб усіх агіднасцях. І вось у адказ на гэту заметку прэзідыум горсовета вынес пастанову, дзе «ў чарговы раз» прыняў да ведама заяву прадстаўніка магілеўскага аддзялення Белдзяржтранса што ім «запраектавана адкрыццё новага маршруту: вакзал — шаўковая фабрыка — Аўтарэмзавод».

Дэпутацкая група глядзіць на гэту пастанову вельмі песімістычна і зусім не ўпэўнена, што яна будзе выканана. Так ужо зарэкамендаваў сябе прэзідыум горсовета перад сваімі выбаршчыкамі.

Яшчэ ў 1935 годзе ў сувязі з 5-гадовым юбілеем існавання скурзавода імя Сталіна, прэзідыум горсовета вынес урачыстую пастанову, дзе, між іншым, гаварылася: 1) Вылучыць адзін аўтобус на абслугоўванне рабочых завода; 2) У гэтым годзе зрабіць рамонт пад'езда да завода». І тое і другое асталося пустым абяцаннем.

Магілеўскі горсовет не толькі сам ігнаруе наказ выбаршчыкаў, але і нічым не дапамагае дэпутацкім групам, калі яны прабуюць што-небудзь рабіць да яго ажыццяўлення.

С. ГАЛКІН.

ЗАРВАЎШЫЙСЯ САМАДУР

Макаронна-мукамольны камбінат імя Леніна (Нова-Барысаў) па выпускаемай прадукцыі мае агульнасаюзнае значэнне. Камбінат поўнасцю забяспечан сыравінай, рабочай сілай; шмат тэхнічнага персанала. І ўсё-ж, не гледзячы на гэта, промфінплан за першы квартал 1937 года выкананы ледзь на 80,5 проц. Не лепш справа і ў другім квартале. Паказальнікі выканання плана за апошнія 5 дзён сведчаць, што з кожным днём процант выпуска прадукцыі памяншаецца. На камбінаце сістэматычныя прастоі з-за паломак машын. У пэхах не арганізаван планава-папераджальны рамонт. Дайшло нават да таго, што ў сакавіку ўвесь камбінат прастаяў тры дні. Не было дробазі — упаковачнай паперы для ўпакоўкі прадукцыі. Характэрна, што папера гэта прыбыла і знаходзіліся ў Барысаве. Патрэбна было толькі 600 р., каб яе выкупіць, але дырэктар Федароўскі не здолеў арганізаваць нават такой справы.

Макарон часта недасушваецца і пэрасушваецца, што нанесла камбінату каля 250.000 рублёў страт. Адсутнасць уліку сыравіны і гатовай прадукцыі на прадпрыемстве прывялі да масавых раскраданняў. На 1 красавіка выяўлен недахват 8 тон мукі, 7 з паловай тон адыходаў і 9 тон вотрубей.

У мінулым годзе на прадпрыемстве было больш 200 стаханаўцаў, якія значна перавыконвалі нормы. Зараз яны налічваюцца адзінкамі. У чым-жа справа? Няўжо яны куды-небудзь зніклі? Усе яны і зараз працуюць. Але ўся бяда ў тым, што тут рашылі, што стаханаўскі рух — чарговая кампанія. Пашумелі, пагаварылі і... забылі. Стаханаўцамі на прадпрыемстве ніхто не кіруе. Рабочыя ўжо не памятаюць, калі склікалі вытворчыя нарады. Не раз заяўлялі аб гэтым дырэктару Федароўскаму, але ён, гэты вяльможа, пагардліва адносіцца да заяў рабочых і зусім не прыслухоўваецца да іх голасу. У пэхах Федароўскі вельмі рэдкі госць. Большасць свайго часу ён трапіць на камандыроўкі, часамі нікому не патрэбныя. З рабочымі, якія выступаюць з крытыкай, Федароўскі жорстка разлічваецца. Ён зволіў з прапы комсамолку Хітрык, якая адважылася крытыкаваць Федароўскага. Таксама расправіўся з загадчыкам планавага аддзела Русецкім, які выступіў у газеце «Большэвік Барысаўшчыны» супроць дырэктара.

На камбінаце сярод рабочых ніякай выхаваўчай работы не праводзіцца.

Уся гэта абстаноўка, якая склалася на камбінаце, стварае адпаведныя ўмовы для работы класавага ворага. За апошнія дні ў прадукцыі знойдзены дробныя часткі метала, цвікі, цэгла, цэмент, смецце і конскі волас.

19 красавіка адбыўся агульны сход рабочых камбіната імя Леніна, дзе прысутнічала больш 250 чалавек. Федароўскі, у якога на камбінаце выкрыты буйныя недахопы, наяўнасць фактаў палітычнай бестурботнасці павінен быў чэсна, на канкратных прыкладах растлумачыць на сходзе прычыны гэтых з'явішчаў. Федароўскі-жа выступіў на сходзе так, што ахаяў усіх прысутных. Гэтым самым ён імкнуўся не даць нікому пасля яго выступаць, выкрываць агіднасці, якія творацца на прадпрыемстве.

Аб такім становішчы камбіната і яго кіраўніцтве сігналізавалі Наркамхарчпрому (нарком Крылоў), але-ж апошнім ніякіх мер не прынята.

Нельга абыйсці маўчаннем і РК КП(б)Б бо ў яго пад бокам знаходзіцца камбінат Праўда, райком партыі тры разы выносіў пастанову аб знятці Федароўскага з працы, але не здолеў правесці свае пастановы ў жыццё. Гэтым самым патураў прайдзісвету Федароўскаму, які творыць свае агідныя справы.

БАРАНОЎСКІ.

Да пытання аб агратэхніцы ільну

У «Звяздзе» ад 14 красавіка апублікован артыкул тт. Власенкі і Чапвярыкова (Інстытут аграглебазнаўства і ўгнаенняў Акадэміі навук БССР) пад назвай «Як атрымаць высокі ўраджай ільну».

Замест таго, каб раіць пераворванне зяблёва на пяжкіх заплываючых глебах па жытнішчу (гл. пастанову СНК СССР ад 2 лютага 1937 г. «Аб дзяржаўным плане веснавой сяўбы»), аўтары рэкамендуюць пружынаванне. Зяблёва-ж на канюшнішчах, якое трэба апрацоўваць дыскаванымі культыватарамі (калі ўчастак не зарос пырнікам), яны рэкамендуюць пераворваць, што, несумненна, будзе звязана з вырошчваннем непэрапрэўшага дзёрнавага, бескарысным стратай азота і псаваннем мікрарэльефа ільнянога поля.

Пасеў ільну спецыяльнай ільнянай радковай сеялкай рэкамендуецца па норме 1,6—1,8 пэнтн. на гектар, крыж-накрыж, з глыбінёй задзелкі насення замест 1,5—2 см. да 3 см.

Рэкамендуемая норма высеву насення ільну для ўсіх выпадкаў, а тым больш для радковай сяўбы, нязмерна высокая (высокая нават для стаханаўскіх звеньняў); яна павяла-б да лішняй страты пасеўнага матэрыялу і к паляганню спецыяльнай ільну, а значыць — да вялікіх страт валакна. Крыж-на-крыжны пасеў ільнянай сеялкай зніжае ў два разы яе сезонную прадукцыйнасць, што пры нелаштатковай колькасці сеялак знізіць агульную эфектыўнасць іх скарыстання.

Задзелка ільнанасення на глыбіню 3 см. недапушчальна, бо гэтым зніжаецца палявая ўсхожасць насення да 37 проц. А калі ўлічыць і тое, што аўтары рэкамендуюць мульчыраванне пасеваў ільну слоем торфу ў 2—3 см. (каля 100 тон торфу на гектар), то гэта — безумоўная гібель амаль усяго пасеянага насення, нават пры высокай норме высеву. Мульчыраванне — добры аграпрыём: ён дастаткова праверан, але класці звыш 30 тон на гектар (слой каля 1 см.) няма падставы.

Па даных апошніх даследаванняў, найлепшым часам унясення ўсіх фосфарных і калійных мінеральных угнаенняў з'яўляецца або восень — пад зяблёва, або, калі не ўнесены з восені — ранняй вясной, як толькі сыйдзе снег з палёў, па замаразках.

Аўтары-ж разглядаемага артыкула ўнясенне гэтых угнаенняў значна прыбліжаюць да сяўбы, рэкамендуючы ўносіць перад пераворваннем або культывацыяй зяблёва (пасля баранавання), што зніжае іх эфэктыўнасць. Асенняе ўнясенне ўгнаенняў яны дапускаюць толькі ў адносінах фасфарытнай мукі і сільвініта.

Але затое аўтары рэкамендуюць уносіць восенню пад зяблёва гноевую жыжу і птушыны памёт, што яўна пацягне за сабою вялікія страты азота. Пры гэтым дазіроўкі для ўнясення мінеральных угнаенняў у вадкім стане ва ўсіх выпадках устанаўляюцца ў бочках, незалежна ад іх ёмістасці.

Рэкамендуюцца вялікія дозы ўнясення азотных угнаенняў—да 2,5 пэнтн. аміячнай селітры і 4 пэнтн. сульфата амонія, што пры ўмовах палкормкі стварае магчымасці ажыццяўлення і знізіць выхад і якасць валакна. Нормы ўнясення калійнай солі недастаткова дыферэнцыраваны (2—3 пэнтн. на гектар амаль для ўсіх выпадкаў).

Мясновыя ўгнаенні — птушыны памёт, гноевая жыжа, фекалій разглядаюцца як замяняючыя азотныя мінеральныя ўгнаенні, а тое, што гэтыя ўгнаенні з'яўляюцца поўнымі (якія маюць у сабе фосфар і калій) ігнаруецца.

Пры паяўнасці ў гаспадарцы аміячнай селітры і іншых канцэнтраваных азотных угнаенняў, мэтазгодней іх захаваць для палкормкі, а маючыяся мясновыя ўгнаенні — птушыны памёт, гноевую жыжу, фекалій унясці да пасеву, бо ўнясенне іх у якасці палкормкі ў вадкім стане звязана з яўлой па пасевах і вядомым псаваннем іх. Аўтары паступаюць якраз наадварот. Яны настойліва рэкамендуюць аміячную селітру і сульфат-амоній уносіць перад пасевам, а палкормку праводзіць у першую чаргу мясновымі вадкімі ўгнаеннямі, упамінаючы аб аміячнай селітры толькі мімаходам.

Прыпадносячы сістэму ўгнаення пал лён на высокіх дозах, аўтары ні адным словам не абмовіліся аб важнасці і неабходнасці глебава-аграхімічных даследаванняў, пабудаваўшы сістэму ўгнаення рэцэптурна і паставіўшы чытача ў становішча незабходнасці дзейнічаць усляпую.

Выключна грубыя памылкі дапушчаны аўтарамі па пытаннях барацьбы са шкоднікамі і хваробамі ільну.

Вопытныя работы раду год паказалі, што пратручваць ільнанасенне трэба не раней, чым за 2—3 дні да пасеву, бо больш ранніх тэрмінаў пратручвання даюць часам значнае зніжэнне ўсхожасці і энергіі прарастання. Аўтары-ж даюць двухсансоўную паралу: «загадзя да пасеву насенне ільну павінна быць пратручана»... Прычым, указваюць дозу прэпарата Давыдава — 750—1500 гр. на тону насення. Дазіроўка ў 750 гр. прэпарата Давыдава на тону насення існуе для другой культуры, а іменна — для пшаніцы, а не для ільнанасення. Для пратручвання насення ільну ўстаноўлена адна доза — 1500 гр. на тону.

Паўнейшая блытаніна ўнесена аўтарамі ў пытаннях па барацьбе з ільнянымі блошкамі і вусенямі соўкі-гамы і лугавога матылька. Для ўсіх гэтых шкоднікаў яны чамусьці выбралі адну і тую-ж дазіроўку — 5 кл. крэмнефторыстага натра або мыш'якова-кіслага кальцыя. Мала таго, аўтары рэкамендуюць для ўсіх гэтых шкоднікаў (не гледзячы на тое, што яны паяўляюцца ў зусім розны час — красавіка да ліпеня) праводзіць апыленне ў адзін і той-жа час. «Апыляць лён патрабуецца два разы. Першы раз, як толькі паяўляюцца першыя ўсходы, і другі раз — праз пяць дзён пасля першага апылення».

Рэкамендуемая дазіроўка як крэмнефторыстага натра, так і мыш'якова-кіслага кальцыя недастатковая. Такая дазіроўка прывядзе толькі да пустой страты дэфіцытных і дарагіх атрут, а эфекту не будзе. Супроць ільняных блошак трэба рэкамендаваць апыленне крэмнефторыстым натрам у дазіроўцы 10 кгр. на гектар, а мыш'якова-кіслым кальцыем у дазіроўцы 8 кгр. на гектар, супроць-жа вусеня соўкі-гамы — на 2 кгр. больш. Прыбаўляць інгрэдзіенты, як да крэмнефторыстага натра, так і мыш'якова-кіслага кальцыя, не рэкамендуецца, бо гэтым паніжаецца таксічнасць прэпаратаў, і асабліва не рэкамендуецца прыбаўляць вапну да крэмнефторыстага натра, бо ад гэтага не толькі зніжаецца таксічнасць атруты, але і можа павысіцца апыльваемасць раслін. Цельга не адзначыць і таго, што прыбаўленне інгрэдзіентаў будзе змяншаць прадукцыйнасць раннавых апыленняў, якія з'яўляюцца асноўнымі апылкавальнікамі ў БССР.

Наўрад ці мэтазгодна рэкамендаваць ва ўмовах сацыялістычнай гаспадаркі барацьбу з блошкай апыленнем залою, бо гэты сродак запалохвае шкодніка, і блыха пры гэтым ідзе на суседнія, нашы-ж калгасныя ільняныя палі.

Агульны вывад такі: парады тт. Власенкі і Чапвярыкова не толькі не дапамогуць калгаснікам Совецкай Беларусі павысіць ураджай ільну, а наадварот — могуць нанесці вялікую шкоду.

Спецыялісты Галоўільна НКЗ СССР:

галоўны аграном І. Е. САМАЎКАЎ,

старшы аграном па хімізацыі А. С. ВІНАГРАДАЎ,

старшы аграном па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі раслін А. М. НІКІФАРАЎ.

АГІДНАСЦІ Ў СМАЛЯНСКІМ ТЭХНІКУМЕ

(Пісьмо комсамольцаў)

Дырэктар нашага смалянскага паляводчага тэхнікума Жукаў не рэагуе на рад недапушчальных фактаў, якія маюць тут месца. Так, яго сваяк Гаралька Васіль, які быў выключан умоўна з тэхнікума за праяўленне антысемітызма, зараз разводзіць варожыя размовы, і ўсё гэта астаецца без рэагавання.

Мала гэтага. У тэхнікуме зусім не рэагуюць на такі факт, калі студэнт Пывінскі малюе на спіне другога студэнта фашысцкія знакі. З якой мэтай гэта рабіў Пывінскі — і па сёння невядома. Студэнты аб гэтым факце не ведаюць.

Тав. Жукаў, як дырэктар, мала клапоціцца аб выкананні вучэбнага плана, які тры разы за навучальны год па невядомых прычынах зменяўся. Прадмет — арганізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці — выкладаецца па незацверджанаму плану. У мінулым годзе на трэцім курсе не прайшлі тэму «арганізацыя МТС» а ў гэтым годзе на чацвертым курсе для яе нават часу не адведзена.

Ужо ў другі раз пасылаюць студэнтаў 4 курса на асеннюю практыку, а на вясновую ні аднаго разу не пасылалі. Калі-ж студэнты гэтага патрабавалі, дык дырэктар выклікаў да сабе комсорга і прафорга курса і загадаў «не ўказваць». Наогул справа выкладання і арганізацыя практыкі ў тэхнікуме пастаўлена з рук вон дрэнна. Выкладчыкі працуюць без праграм. Кожны з іх перагружаны і не можа даць студэнтам максімум таго, што патрабуецца ад лекцыі.

Зусім не клапоціцца дырэкцыя тэхнікума аб студэнтах і ўмовах іх жыцця. У інтэрнатах пануе антысанітарыя, адсутнічае святло, няма пакою для адпачынку. Гэта прыводзіць да частых захворванняў студэнтаў, якім дырэкцыя ніякай медыцынскай дапамогі не аказвае. Фактаў бяздушных адносін з боку Жукава да студэнтаў у нашым тэхнікуме безліч.

Гаспадарчы бок тэхнікума вядзецца ніяк патрэбна. Нядаўна дырэктар замест паляпшэння харчавання студэнтаў, сродкамі ў суме 600 рублёў, адшукчаным для гэтай мэты, пакрыў растрату загадчыка сталовай. Студэнтам-выдатнікам яшчэ не выплачаны прэміі, якія вызначаны ў лістападзе мінулага года.

Многа агідных спраў творыцца у тэхнікуме. Трэба Наркамзему БССР неадкладна і хутка на іх рэагаваць.

КАЖАРОЎ, ЖЫХОР, МУРАШКА МІЗАЎЦОЎ.

Аршанскі раён.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

„ВОРАГ РАЗВАЛЬВАЕ ШКОЛУ“

Пад такой назвай у «Звяздзе» 1 сакавіка гэтага года была змешчана караспандэнцыя М. Мельцына аб першай беларускай жлобінскай чыгуначнай школе.

Як паведамляе аддзел школ Беларускай чыгункі, праверкай устаноўлена нездавальняючае становішча жлобінскай школы, у прыватнасці выключная запушчанасць выкладання роднай мовы і літаратуры і рад іншых буйных недахопаў, стварыўшых спрыяльную глебу для падрыўнай дзейнасці класавага ворага. З гэтай прычыны дырэктар школы Яраслаўцаў адхілен ад займаемай пасады, і справа аб ім разглядаецца ў адпаведных парторганах. Знят з займаемай пасады загадчык навучальнай часткі школы Самацветаў. Таксама знят з работы выкладчык мовы і літаратуры Прохараў.

Пры праверцы карэспандэнцыі высветлілася, што настаўнік Ігнаценка, выключаны (у 1929 годзе) з партыі, як утаіўшы сваё социяльнае паходжанне, сапраўды ў 1934 годзе абвінавачваўся у нацдэмаўскай дзейнасці, але быў рэабілітаван і звернут на мэсца сваёй ранейшай работы. Даныя, выкладзеныя аб ім у карэспандэнцыі не пацвердзіліся.

У сувязі са справамі жлобінскай школы паліталдзелам і аддзелам школ Беларускай чыгункі прыняты адпаведныя мэры да ўмацавання гэтай школы.

ЗДЗІЎЛЯЮЧАЯ БЕСКЛАПОТНАСЦЬ ГАЛОЎЛІТА

На паліцах школьных бібліятэк да гэтага часу знаходзяць сабе прытулак «тваранні» контррэволюцыйных нацдэмаў, ворагаў беларускага народу Гартнага, Зарэцкага, Баранавых, Сташэўскага, Мікуліча, Скрыгана, Хадыкі, Звонака, Чарота і інш. з гэтай шайкі. Так, у бібліятэцы ўраварацкай беларускай сярэдняй школы вы можаце знайсці контррэволюцыйны твор Зарэцкага «Вязьмо», бяздарныя варожыя п'есы Сташэўскага, паклёпніцкую пісаніну Скрыгана. На паліцах веткаўскай рускай сярэдняй школы красуюцца кулацкія антысовецкія творы Баранавых «Новая дарога», «Пастка». Гэтыя-ж кнігі таксама знаходзяцца і ў бібліятэцы веткаўскай няпоўнай сярэдняй яўрэйскай школы.

Пры высвятленні аказалася, што з Галоўліта яшчэ да гэтага часу няма ўказання наконт гэтай варожай літаратуры. Гэта здзіўляючая бесклапотнасць Галоўліта выклікае недаўменне.

Н. ГАРТНЫ.



18 красавіка Цэнтральны аэраклуб імя Косарэва (Масква) прыняў спартыўныя самалёты канструкцыі тав. Якаўлева для спартыўных атрадаў аэраклуба. НА ЗДЫМКУ: адзін з спартыўных самалётаў канструкцыі тав. Якаўлева.

Фото Л. Велікжаніна (СФ).

ДРУЖНА РАСТУЦЬ АЗІМЫЯ І ЯРАВЫЯ

ХОЙНІКІ. Добра перазімавалі азімае жыта і пшаніца. Яны амаль не пацярпелі ад маразоў і вымачак. З пачатку вясны халады крыху затрымалі іх рост, як і рост яравых. Некаторыя раннія пасевы яравых узышлі толькі на трынаццаты дзень. 18 красавіка надвор'е пацяплела, прайшлі цёплыя дажджы. Пачалі дружна расці азімыя і яравыя. На многіх участках азімае жыта дасягае 25 см., пшаніца—10—15 см.

На рэкордным участку ў калгасе «Чырвоны сцяг» жыта дасягае ў вышыню 30 см. На яравізаваных пасевах з'явіўся трэці ліст. Хутка зацвіце ігруша.

***

ПЕТРЫКАЎ. Пасля прайшоўшых дажджоў у раёне ўстанавілася добрае цёплае надвор'е. Тэмпература 15—16 градусаў цяпла. Хутка расце трава. Калгасная жывёла пайшла на пазбішча. На бярозе, клёне, вярбе і топалі з'явіліся лісцікі. У садах зацвіла ігруша і вішня.

Калгасныя палі пакрываюцца ўсходамі яравых. У калгасе імя Молатава на плошчы 40 гектараў ячменю і аўса, засеяных радковымі сеялкамі, усходы дасягнулі 3—4 см. росту. Таксама ўзышоў лён на плошчы 15 гектараў.

Добра пачалі расці азімыя. У калгасе «Новы Брынёў» азімае жыта ўжо мае 18 см. росту. Да 20 см. вырасла азімая пшаніца ў калгасе «Новае жыццё». Калгаснікі пачалі рыхтавацца да першай праполкі азімых.

(БЕЛТА).

НАСУСТРАЧ ПЕРШАМУ МАЯ

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА

Да Першамайскага свята ў Доме Чырвонай Арміі імя К. Е. Варашылава адкрываецца выстаўка работ мастакоў і скульптараў-самавучак менскага гарнізона (байцоў, камандзіраў і членаў сямей начскладу). Прадстаўлена каля 100 работ. У арганізацыі выстаўкі актыўную дапамогу аказалі мастакі і скульптары БССР тт. Гусеў, Пашкевіч, Волкаў, Бразер, Азгур і інш. Выстаўка адкрыецца 2 мая і працягнецца каля месяца.

ПА РАЁНАХ РЭСПУБЛІКІ

Ва ўсіх раёнах нашай рэспублікі ідзе дзейсная падрыхтоўка да свята міжнароднай пролетарскай салідарнасці — Першае мая. Учора супрацоўнік «Звязды» звязаўся па тэлефону з радам раёнаў, адкуль паведамілі як ідзе падрыхтоўка і як будзе праведзена свята.

⊙ — У **Шклоўскім** раёне — паведаміў старшыня РВК т. Козінцаў — у першамайскія дні ў 50 калгасах адкрываюцца дзіцячыя яслі. У раённым цэнтры дням закончан капітальны рамонт будынка раённай бібліятэкі. Забрукавана Дняпроўская вуліца.

Першае мая калгасы сустракаюць перамогай на палях. У раёне закончана сяўба ільну на плошчы 8.250 гектараў. 30 красавіка адбудзецца ўрачысты пленум Шклоўскага горсовета. У якім прымуць удзел лепшыя стаханаўцы калгасных палёў.

⊙ У **Асіпавічах** прыступілі да будаўніцтва каменнага будынка — чыгуначнай школы дзесяцігодкі. У Лапіцкім сельсавеце ў дні свята адкрываецца новы клуб з глядзельнай залай на 200 месц. У раённым доме соцкультуры, у клубе чыгуначнікаў і шклозавода «Окцябр» адбудуцца вечары мастацкай самадзейнасці. Пачалося ўпрыгожванне горада. На скверы ля помніка Леніну разбіваюцца клумбы, высаджваюцца кветкі.

⊙ — У 15 калгасах **Дубровенскага** раёна, — паведаміў сакратар РК КП(б)Б т. Мышалаў,— адкрываюцца дзіцячыя яслі. Днямі закончылі сяўбу ільну калгасы «Чырвонае пабяражжа», імя Будзённага, «Перамога» і інш. Калгаснікі раёна змагаюцца за сканчэнне да 1 мая сяўбы ільну на плошчы 6.300 гектараў. На прадпрыемствах, у калгасах і ўстановах раёна праводзяцца гутаркі аб Першым маі.

⊙ — Мястэчка **Талачын** упрыгожваецца і азеляняецца — паведаміў намеснік старшыні РВК т. Лашчэнка. Па вуліцах ужо высаджана 100 дэкаратыўных дрэў. Пачалося брукаванне вуліц.

У Друцкім і Аленавіцкім сельсоветах адкрываюцца клубы. Днямі ў раёне закончана сяўба ільну на плошчы 4.500 гектараў.

ПЕРАСЯЛЕНЦЫ Ў БІРАБІДЖАН

БССР — шэф Яўрэйскай аўтаномнай вобласці—аказвае Біраб'джану вялікую дапамогу ў заселенні края і забеспячэнні яго кваліфікаванымі кадрамі.

Штодзенна ў Белкамзет паступаюць дзесяткі заяў ад працоўных яўрэяў БССР, якія жадаюць пераехаць у Біраб'джан. 300 чалавек чакаюць чарговай адпраўкі. Сярод іх — работнікі 54 прафесій.

У сувязі з трохгоддзем арганізацыі Яўрэйскай аўтаномнай вобласці Белкамзет падводзіць вынікі работы па перасяленню. За тры гады з раёнаў БССР перасяліліся ў Біраб'джан 3.313 чалавек. Сярод іх значная колькасць калгаснікаў, швейнікаў, плотнікаў, металістаў, дрэваапрацоўшчыкаў, чорнарабочых, шаўцоў, ёсць і ўрачы, навуковыя работнікі, педагогі, інжынеры і тэхнікі.

Усе яны працуюць ў калгасах, на прадпрыемствах, ва ўстановах, на лесараспрацоўках Біраб'джана.

ЧЭСНАСЦЬ

21 красавіка намеснік галоўнага бухгалтара аршанскага гравійнага кар'ера тав. Ліхновіч пры здачы грошай у касу аршанскага аддзялення Дзяржбанка забыў каля касавага акна 1.079 рублёў. Гэтыя грошы былі знойдзены кур'ерам Ваенгандля Мальвінай Ляшчук, якая, выканаўшы абавязак савецкага грамадзяніна, аднесла гэтыя грошы бухгалтару Дзяржбанка з просьбай вярнуць іх пацярпеўшаму.

КАЗЫРЭВІЧ.

ЛЁГКАВАДАЛАЗНЫ СПОРТ

Усесаюзны камітэт па справах фізкультуры і спорту пры СНК СССР увёў значкі фізкультурнікаў-валдалазаў першай і другой ступеняў і ў гэтым годзе прыступае да разгортвання лёгкага валдалазнага спорту.

Падобна парашутызму гэты спорт павінен стаць здабыткам совецкай моладзі. Лёгкі валдалаз неабходны пры выратаванні ўтапаючых, абследванні дна, ліквідацыі дробных аварый і пры інш. падводных работах на вялікіх глыбінях. Лёгкі валдалаз карыстаецца падводным апаратам «ВІА-2» на спіслым кіслародзе, які ў адрозненне ад скафандра не патрабуе падачы паветра з паверхні. Валдалаз знаходзіцца з паверхняй толькі сігнальнай вяроўкай і можа працаваць на глыбіні да 20 метраў 1—2 гадзіны.

На кожнай воднай станцыі павінны быць навучаныя лёгкія валдалазы, узброеныя гэтым апаратам. Тэрмін падрыхтоўкі значкіста першай ступені 10—12 дзён. У Менску пры басейне Дома Чырвонай Арміі імя Варашылава арганізуецца першы вучэбны лёгкавадалазны пункт. У Маскву накіраваны на інструктарскія месячныя курсы Цэнтральнай вучэбна-валдалазнай станцыі менскія інструктары па плаванню тт. Мароз і Бражнікаў.

ЖАНОЧЫЯ БРЫГАДЫ ПА АЗЯЛЯНЕННЮ ГАРАДКА

Нядаўна адбылася нарада жонак камандзіраў №-скай вайсковай часці. На нарадзе былі арганізаваны жаночыя брыгады па азеляненню вайсковага гарадка. Жанчыны-брыгадзіры тт. Ветліцына, Трацякова, Сінічкіна, Круглова, Дабрахвотава і Падсадная ўзялі на сябе абавязак вырошчваць рассаду для клумбаў. Ужо загатоўлена насенне і пасенна ў скрынкі з зямлёй. У некаторых скрынках паявіліся першыя добрыя ўсходы рассады для азеляненння гарадка.

П. КЛАЧКОЎ.

НОВЫ ЛЕТНІ РАСКЛАД ПАЯЗДОЎ

З 15 мая на чыгунках БССР уводзіцца новы летні расклад руху паяздоў.

Адпраўленне з Менска на Маскву: кур'ерскі поезд штодзенна ў 22 г. 46 м., «Страла» — з г. 42 м. (па пятніцах, чацвяргах, суботах), хуткі — 20 г. 35 м., пасажырскі — 16 г. 15 м., паштовы — 10 г. 48 м.

Паязды на Крэменчук — пасажырскі—штодзенна 0 г. 44 м., на Сухініччы праз Магілеў—паштовы—у 18 г. 22 м., на Дняпрапетроўск—паштовы — 7 г. 30 м., на Харкаў — пасажырскі — 13 г.

Прыбыцце ў Менск з Масквы: кур'ерскага поезда штодзенна ў 11 г. 38 м., «Стралы» — 5 г. 39 м. (па аўторках, чацвяргах, суботах), хуткага — у 9 г. 35 м., пасажырскага — 17 г. 10 м., паштовага — 8 г. 15 м.; з Крэменчука штодзенна — у 6 г. 16 м., з Сухініч — 9 г. 55 м., Харкава — 22 г. 15 м., з Дняпрапетроўска — 19 г. 30 м.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ДЗЕННІК

Нарада сакратароў парткомаў і парторгаў, дырэктароў прадпрыемстваў, кіраўнікоў устаноў і старшынь заўкомаў, мясцкомаў Варашылаўскага раёна абудзецца 28 красавіка ў 2 гадзіны дня ў памяшканні клуба саўгандслужачых (рог Энгельса і Комуністычнай).

Варашылаўскі РК КП(б)Б.

— Менскі Дом Чырвонай Арміі даводзіць да ведама, што даклад, назначаны на 29 красавіка 1937 года на тэму «Будучая вайна», пераносіцца з прычыны хваробы дакладчыка на май. Аб дні даклада будзе абвешчана.

Беларускай канторы «Сельгасснабжэнне»

ПАТРАБУЕЦЦА ІНЖЫНЕР-МЕХАНІК па мантажу

і ўстаноўцы ветрарухавікоў.

Звяртацца па адрасу: Менск, Совецкая, 46, тэлефон № 23-714.

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)

28 красавіка Абан. № 95

ПЛАТОН КРЭЧЭТ

Памяшк. Дзярж. Яўрэйск. тэатра | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

28 красавіка Абан. № 25

РЫГАЛЕТО

Рыхтуецца да пастаноўкі опера «ФЛОРЫЯ ТОСКА»

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» «ЧУДЕСНИЦА»

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» НАЗАР СТАДОЛЯ

Дзіцячы гукавы кінотэатр ЗБОРНАЯ ПРАГРАМА

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» ЗАЛАТОЕ ВОЗЕРА

Гукавы кінотэатр «Спартак» ІУДУШКА ГАЛАЎЛЁЎ

УВАГА! Заключайце ДАГАВОРЫ да першамайскіх свят

МЕНСКІ ТРЭСТ РЭСТАРАНАЎ і КАФЭ

прымае ЗАКАЗЫ НА АРГАНІЗАЦЫЮ СЯМЕЙНЫХ ВЕЧАРОЎ, ТАВАРЫСКІХ СУСТРЭЧ, БАНКЕТАЎ і т. д.

ПАПЯРЭДНІЯ

ЁСЦЬ ВЯЛІКІ АСАРТЫМЕНТ:

РОЗНЫХ ЗАКУСАК ГАРАЧЫХ СТРАЎ ЛЕПШЫХ ВІН КАНДЫТАРСКІХ ВЫРАБАЎ

МАРОЖАНАГА ПІВА ПРАХЛАДЖАЛЬНЫХ НАПІТКАЎ і інш.

ЗАКАЗЫ ПРЫМАЮЦЬ:

ФАБРЫКА-КУХНЯ — тэл. 25-530; 24-462

РЭСТАРАН «ЕЎРОПА» — тэл. 22-321

СТАЛОВАЯ № 1 — тэл. 20-837

СТАЛОВАЯ № 2 — тэл. 25-588

ПРЫМАЮЦЦА ТАКСАМА ЗАКАЗЫ ПА АБСЛУГОЎВАННЮ на дому ДЫРЭКЦЫЯ.

ІНСТЫТУТ МАСАВАГА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ ПАРТАКТЫВА ПРЫ ЦК КП(б)Б

Слухайце радыёлекцыі завочнай партвучобы ў маі 1937 г.

праз менскую радыёстанцыю РВ-10

ЧАС ПЕРАДАЧЫ: штодзенна (апрача 6, 12, 18, 24, 30) з 18 г. 30 м. да 19 г. 45 м. па наступных чыслах: 3, 10, 13, 14, 16, 17, 20, 22, 23, 26, 27, 28, 31.

З 18 г. 30 м. да 19 г. 30 м. па наступных чыслах: 4, 5, 7, 8, 9, 11, 15, 19, 21, 25, 29.

Трансляцыя з Масквы з 18 г. 30 м. да 19 г. 45 м. па наступных чыслах: 10, 17, 20.

Курс гісторыі ВКП(б) на па вышэйшым узроўні перадаецца днём з 12 г. 30 м. да 13 г. 45 м. па наступных чыслах: 10, 15, 16, 20, 21.

ГІСТОРЫЯ ВКП(б) Папулярны курс

3-V—Партыя большэвікоў пры пераходзе да новай эканамічнай палітыкі.

13-V—Партыя большэвікоў у барацьбе за социялістычнае наступленне ў аднаўленчы перыяд.

23-V—Партыя большэвікоў у барацьбе за ленінскую лінію на індустрыялізацыю краіны.

ГІСТОРЫЯ ВКП(б) Навышаны курс

ЧАС ПЕРАДАЧЫ з 12 г. 30 м. да 13 г. 45 м.

10, 15, 20 — X з'езд партыі большэвікоў і яго гістарычнае значэнне.

16, 21 — Партыя большэвікоў у першы год НЭП'а.

ВЯЧЭРНІЯ ПЕРАДАЧЫ (трансляцыя з Масквы). Час перадачы з 18 г. 30 м. да 19 г. 45 м.

10-V—Партыя большэвікоў у першы год НЭП'а.

17-V—Партыя большэвікоў на чале наступлення на аснове НЭП'а.

20-V—Барацьба партыі большэвікоў з троцкісцкай апазіцыяй у перыяд 1923—1924 гг.

ГІСТОРЫЯ СССР

4-V—Дваранская манархія XVIII стагоддзя і сялянская вайна.

9-V—Манархія Паўла I і Александра I. Вайна 1812 г.

11-V—Дзекабрысты.

21-V—Самадзяржаўе Нікалая I. Грамадскі рух 30—40 гг. (Лекцыя 1-я).

20-V—Самадзяржаўе Нікалая I. Грамадскі рух 30—40 гг. (Лекцыя 2-я).

ЛЕНІНІЗМ

14-V—Вырашэнне нацыянальнага пытання пры дыктатуры пролетарыята.

28-V—Стратэгія і тактыка большэвізма.

31-V—Вучэнне аб партыі.

ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ

16-V—Сусветны эканамічны крызіс і сучасная дапрэсія асобага роду.

22-V—Вялікая социялістычная революцыя ў СССР і яе асноўныя этапы. (Лекцыя 1-я).

26-V—Вялікая социялістычная революцыя ў СССР і яе асноўныя этапы. (Лекцыя 2-я).

27-V—Социялістычная сістэма гаспадаркі. Дзве формы социялістычнай уласнасці на сродкі вытворчасці.

БЯГУЧАЯ ПАЛІТЫКА ПАРТЫІ І ЎРАДА

5, 7, 15, 25 мая. (Тэмы лекцый будуць абвешчаны па радыё).

Рэзерв — 8 і 19 мая.

ТАВАРЫШЫ ЗАВОЧНІКІ І РАДЫЁСЛУХАЧЫ!

Пытанні, якія ўзнікнуць у сувязі з праслуханай Вамі лекцыяй і прапрацоўкай вучэбнай літаратуры, а таксама водзывы і заўвагі аб лекцыях, накіроўвайце па адрасу:

Менск, вул. Карла Маркса, 47/30, БІМЗО.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

ДА ВЕДАМА ГРАМАДЗЯН, якія ЗАХОЎВАЮЦЬ АБЛІГАЦЫІ

ДЗЯРЖАЎНЫХ ПАЗЫК У АШЧАДНЫХ КАСАХ

АШЧАДНЫЯ КАСЫ разаслалі трымальнікам, якія захоўваюць свае аблігацыі ранейшых пазык у ашчадкасах, паведамленні аб парадку і тэрмінах абмену гэтых аблігацый на аблігацыі пазыкі «Другой пяцігодкі» (выпуск чацвертага года) у сувязі з канверсіяй.

ЧАСТКА РАЗАСЛАНЫХ паведамленняў вернута назад у ашчадкасы за незнаходжаннем адрасатаў, бо ўладальнікі аблігацый пры пераездзе не паведамілі ашчадкасы аб сваім новым адрасе.

Кіраўніцтва ашчадкас і дзяржкрэдыта БССР напамінае:

АБМЕН АБЛІГАЦЫЙ РАНЕЙШЫХ ПАЗЫК, якія знаходзяцца на хаванні ў ашчадкасах, праводзіцца да 1 верасня 1937 г. пры асабістай яўцы ўладальніка або па яго пісьмовай заяве, з высылкай захоўна-ссуднага пасведчання.

ПАСЛЯ І ВЕРАСНЯ 1937 г. УСЕ НЕАБМЕНЕНЫЯ АБЛІГАЦЫІ РАНЕЙШЫХ ПАЗЫК ТРАЦЯЦЬ СВАЮ СІЛУ І АБМЕНЬВАЦЦА НЕ БУДУЦЬ.

25 МАЯ 1937 г. У МАСКВЕ АДБУДЗЕЦЦА ПЕРШЫ ТЫРАЖ ВЫІГРЫШАЎ ПАЗЫКІ «ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ» (выпуск чацвертага года). Трымальнікі, якія не абмянялі да гэтага тэрміну свае аблігацыі, не змогуць прымаць удзелу ў тыражы выйгрышаў.

ГРАМАДЗЯНАМ, якія захоўваюць свае аблігацыі ў ашчадкасах і перамянілі месцажыхарства, неабходна з'явіцца асабіста ў ашчадкасу або прыслаць заяву аб абмене аблігацый. У заяве трэба ўказаць: а) на якія аблігацыі пазыкі «Другой пяцігодкі» (выпуск чацвертага года) трымальнік жадае абмяняць аблігацыі ранейшых пазык і б) ці жадае трымальнік пакінуць аблігацыі пасля абмену на далейшае хаванне ў ашчаднай касе або патрабуе выслаць аблігацыі па новаму адрасу.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

БЕЛАРУСКІ ТРЭСТ ГАЛОЎХЛЕБ (Менск, Совецкая, 43/13)

ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ ДА ПЕРШАМАЙСКІХ СВЯТ ад устаноў, прадпрыемстваў, асобных раёнаў, сельпо і асоб З ДАСТАЎКАЙ

НА ВЫСОКАРЭЦЭПТУРНЫЯ ВЫРАБЫ:

ТАРТЫ, КЕКСЫ, ПІРОЖНЫЯ, СУХАРЫ, ПЯЧЭННЕ, і іншыя ЗДОБЫ і КАНДЫТАРСКІЯ ВЫРАБЫ

ВЫПУШЧАН ТАКСАМА СПЕЦЫЯЛЬНЫ ДЗІЦЯЧЫ АСАРТЫМЕНТ—

ТАРТЫ КЕКСЫ ПІРОЖНЫЯ

Фігурныя выробы і розныя гатункі ПЯЧЭННЯ.

ЗАКАЗЫ прымаюць хлебазаводы:

у Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве, Оршы, Барысаве, Бабруйску, Мазыры, Полацку, Жлобіне, Рэчыцы, Слуцку.

Таксама можна заказваць праз Галоўхлеб тэлеграфна і па тэлефонах 23-648 і 24-492.

НАРКАМХАРЧПРОМ БССР

МАЛОЧНЫ КАМБІНАТ

ГЭТЫМІ ДНЯМІ АДКРЫВАЕ па Маскоўскай, 15 (інтэрнат БДУ)

СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫ

МАЛОЧНЫ МАГАЗІН

У МАГАЗІНЕ БУДЗЕ ў ПРОДАЖЫ

САМЫ ШЫРОКІ АСАРТЫМЕНТ

МАЛОЧНЫХ ПРАДУКТАЎ, КАНДЫТАРСКІХ ВЫРАБАЎ.

МАРОЖАНАГА І КАЎБАСНЫХ ВЫРАБАЎ.

Магазін будзе адкрыт з 9 гадзін раніцы, да 12 гадзін ночы.

ДЫРЭКЦЫЯ.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛЕФОНУ № 21-845

Уп. Галоўлітбела № К—2074. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Б., К., С.